Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЛЮТАГА 2020 г. СЕРАДА № 23 (29137)

## ЯРКАЯ ПАДЗЕЯ ДУХОЎНАГА ЖЫЦЦЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу і VI Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што кніжны форум па праву стаў яркай падзеяй культурнага і духоўнага жыцця Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі стаўленне да кнігі заўсёды было асаблівым, беражлівым, уважлівым, а пытанні захавання і эфектыўнага развіцця выдавецкай галіны застаюцца ў ліку важных дзяржаўных прыярытэтаў. «Перакананы, што выстава і надалей будзе садзейнічаць прапагандзе якаснай літаратуры і культуры чытання, паслужыць умацаванню міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва», — адзначыў Прэзідэнт.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль МАРКЕВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці:**

*«З аднаго боку, на жаль, памяншаецца колькасць вучняў у сельскай мясцовасці, таму мы павінны рацыянальна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі. Але з іншага боку, выдатна разумеем, што школа — гэта ачаг культуры і адукацыі, там дзеці атрымліваюць веды і праводзяць вольны час. Да пытанняў аптымізацыі трэба падыходзіць вельмі ўзважана і прымаць разумныя рашэнні. Важна не памыліцца ў гэтай сітуацыі. Упэўнены, што на ўзроўні кожнага рэгіёна гэтае пытанне ў той ці іншай ступені гучыць. Прымаць паспешныя рашэнні ніхто не будзе, а толькі пасля дэталёвага вывучэння, наколькі тая ці іншая навучальная ўстанова можа працягваць работу».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У мяне ні да каго няма асабістых прэтэнзій, я абараняю інтарэсы дзяржавы»

### Падчас рабочай паездкі ў Добруш Прэзідэнт абазначыў прыярытэты не толькі ў развіцці прамысловасці, але і ў грамадска-палітычных пытаннях

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхналогіяй завода па вытворчасці мелаванага і немелаванага кардону на Добрушскай папяровай фабрыцы «Герой працы». Кіраўнік дзяржавы пажадаў на свае вочы пабачыць, на што ўрад просіць выдзеліць грошы з бюджэту. Акрамя таго, беларускі лідар адказаў на пытанні журналістаў на надзённыя тэмы і наведаў Добрушскі фарфоравы завод, хоць апошняе і не прадугледжвалася планам яго рабочай паездкі.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

# СЛОВА — НА ВЫШЫНІ





**Студэнтка сталічнага архітэктурна-будаўнічага каледжа Алена ПЯТРЭНКА не першы раз удзельнічае ў падрыхтоўцы Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі, якая адкрываецца сёння. Гэтым разам яна дапамагае ў афармленні стэндавых пляцовак для выдавецкіх арганізацый. Яе рукамі прыклеены і лагатып Выдавецкага дома «Звязда».**

**Фотарэпартаж аб тым, як рыхтавалася выстаўка за дзень да адкрыцця, — на 13-й старонцы.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, з 920 кітайскіх студэнтаў, што з'ехалі на канікулы, у Беларусь вярнуліся каля 50.
- **Праект у галіне прамянёвай тэрапіі супраць раку будзе падтрыманы бюджэтам.**
- Адзіная абласная служба 115 запрацавала ў Магілёве.
- **У краіне сёлета плануецца замяніць 626 кіламетраў цеплассетак.**
- Тураўскі малочны камбінат планує нарасціць вытворчасць сыроў да 30 тысяч тон у 2020 годзе.
- **Экспазіцыя да 90-годдзя Расціслава Янкоўскага адкрыецца ў тэатры імя Горкага 5 лютага.**
- Беларус прыехаў на радзіму са знаёмым з Германіі, каб скрасці яго аўтамабіль, і прывёз з сабой какаін для продажу.

Размова па сутнасці

# З глыбіні стагоддзяў і зямлі

### Чым жыве сучасная беларуская археалогія

**Апошнім часам беларускія археолагі сталі сапраўднымі вытворцамі навін для інтэрнэту. То ратуюць ад бульдозераў магільнікі ў Гальшанах, то знаходзяць у Бярэзіне шлем, які нібыта належаў самому Ізяславу, то абвяшчаюць, што гарадзішча жалезнага веку цалкам даследавана... Начытаешся і думаеш: цікавая ў людзей работа, хоць і пыльная. І за ўсім гэтым забываешся, што археалогія — сур'ёзная навука, што гэтыя людзі робяць вельмі важную для народа і дзяржавы (і гэта без пафасу сказана) справу, што ў гэтай рабоце ў іх нямала перашкод, што не кожны той археолаг, хто капае... Аб усім гэтым у канферэнц-залу «Звязды» мы запрасілі паразмаўляць самых спецыялістаў, якія да практычнай археалогіі маюць самае непасрэднае дачыненне.**

СТАР. 8-9



Гэты трохсантыметровы кавалачак амулета адносіўся да культу сонца (другая палова трэцяга тысячагоддзя да нашай эры).

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

# «У мяне ні да каго няма асабістых прэтэнзій, я абараняю інтарэсы дзяржавы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ДОБРА, КАЛІ ЁСЦЬ СВАЁ

Завод мелаванага і немелаванага кардону павінен быў запрацаваць яшчэ пяць гадоў таму, але генеральны падрадчык, у якасці якога выступіла кітайская кампанія, не справіўся са сваімі абавязацельствамі да канца. Пазней да рэалізацыі праекта падключыліся беларуская і аўстрыйская кампаніі. Цяпер завод у высокай ступені гатоўнасці, але для яго запуску патрабуецца каля 83 мільёнаў долараў. На што? — было галоўнае пытанне Прэзідэнта.

Кіраўнік канцэрна Беллеспаперпрам Юрый Назараў падрабязна расказаў пра тэхналагічны працэс будучай вытворчасці. Новы завод будзе вырабляць па безадходнай тэхналогіі кардон, аналагаў якому на постсавецкай прасторы няма, — яго будучыню выкарыстоўваюць для ўпакоўкі лекаў, кандытарскіх вырабаў, цыгарэт. Дадатковыя грошы патрэбны, каб разлічыцца з аўстрыйскай кампаніяй, беларускімі энергетыкамі і кампаніяй, якая адказвае за водаачыстку, і для запуску вытворчасці.

Новая машына дазволіць цалкам замяніць дзве старыя, якія маюцца на фабрыцы. Прэзідэнт адразу пацікавіўся, што будзе размешчана на плошчах, якія вызваляцца. Ён падтрымаў ідэю знайсці інвестараў, якія размесцяць на іх вытворчасць упакоўкі і прапанаваў канцэрну рабіць упакоўку самастойна, калі ў хуткім часе інвестары не знойдуцца. У Беларусь штогод завозіцца каля 20 тысячы тон кардону для вырабу ўпакоўкі і столькі ж гатовай упакоўкі. Пасля выхаду на праектную магутнасць новай вытворчасці ў Добрушы Беларусь не толькі цалкам задаволіць унутраныя патрэбы ў такім кардоне, але зможа яшчэ 150 тысяч тон яго пастаўляць на экспарт.

***Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на тое, што важна, каб усё ці амаль усё абсталяванне новага завода выраблялася на беларускіх прадпрыемствах. «Ні ў якім разе мы выдаткоўваць валюту на гэта не павінны. Гэта таксама імпартазамяшчэнне. Нам трэба валюту зарабляць».***

Прэзідэнт прывёў прыклад з рухавіком рубільнай машыны, выраблять які самім не выгадна, бо гэта не серыйная вытворчасць, а вось нажы для гэтай машыны павінны ўжо быць беларускія.

## ПАЧНЁМ З ЧЫСТАГА ЛІСТА

Пазней сваімі думкамі пра будучае папяровай фабрыкі і самога Добруша (вакол прадпрыемства са 150-гадовай гісторыяй фактычна будаваўся горад і лёс амаль кожнай сям'і дабрушчан звязаны з ім) Прэзідэнт падзяліўся з журналістамі.

Да канца года фабрыка выйдзе на работу ў нармальным рэжыме, паабяцаў кіраўнік дзяржавы. Вытворчасць запусцяць поўнасцю, створаць сістэму кіравання, канчаткова наладзяць энергетычныя ўстаноўкі. Гэтыя задачы амаль поўнасцю выканаюць айчынныя спецыялісты. Замежная фірма дапаможа запусціць машыну па мелаванні паперы.


Прадукцыя Добрушскага фарфоравага завода — пазнавальны брэнд горада.
Фота БелТА.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што прадпрыемства павінна ствараць гатовую прадукцыю, а не пастаўляць вырабы-паўфабрыкаты.

«Пачкі для цыгарэт, вокладкі для часопісаў, сшыткаў і іншае мы, жывучы ў лесе, завозім з-за мяжы. Мы павінны вызначыцца. І рабіць гэта да канца года пачнём тут, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Будзем гэта рабіць, чаго б гэта нам ні каштавала. А каштаваць гэта будзе няшмат у параўнанні з гэтай будоўляй, таму што мы ўмеем гэта рабіць. Няхай жыхары Добруша не хвалююцца».

Па словах Прэзідэнта, новую вытворчасць запусцяць у верасні, у снежні пачнецца выпуск гатовай прадукцыі.

* * *

**Журналісты скарысталіся магчымасцю і задалі кіраўніку дзяржавы некалькі надзённых пытанняў на іншыя тэмы.**

## ЖЫВЁМ УЛАСНЫМ РОЗУМАМ

Адно з іх датычылася рэакцыі расійскіх СМІ на візіт дзяржсакратара ЗША ў Мінск. Двухгаловы расійскі арол глядзіць у розныя бакі, а Беларусь, размешчаная ў цэнтры Еўропы, пазірае вакол і жыве сваім розумам. Так Прэзідэнт адказаў на пытанне журналістаў наконт чарговых чутак пра «разварот» Беларусі ад Расіі ў бок ЗША.

Як запэўніў кіраўнік краіны, у нашай дзяржавы шмат партнёраў у свеце. ***Амерыканцаў назваць аддаными сябрамі беларусаў цяжка, але часы халадоў і жалезных заслонаў, па словах Аляксандра Лукашэнкі, скончыліся. «Мы наладжваем адносіны з вялікай імперыяй, вядучай краінай свету.*** У Расіі занепакоіліся. А што мы большае зрабілі з Амерыкай, чым Расія?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт, дадаўшы: Беларусь радуецца, калі Расія і ЗША ўсталёўваюць добрыя адносіны.

Прэзідэнт зноў нагадаў пра паспяховыя сумесныя аперацыі айчынных спецслужбаў з амерыканскімі. Ён адзначыў, што партнёры з ЗША ацанілі пазіцыю Беларусі: вырашыць канфлікт на Украіне немагчыма без удзелу гэтай краіны. Дарэчы, карані і айчыннага Парку высокіх тэхналогій ідуць з супрацоўніцтва з амерыканскімі партнёрамі.

***«Яны (амерыканцы — «Зв.») убачылі рэальную Беларусь, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І правоў тут хапае, і нікому жыць не перашкаджаюць».***

Прэзідэнт расказаў, што раней Уладзімір Пуцін сам прасіў яго наладжваць адносіны са Злучанымі Штатамі. Гэта ён і робіць.

Сустрэчу з Майклам Пампеа кіраўнік дзяржавы ахарактарызаваў як сяброўскі абмен думкамі. Амерыканцы валодаюць інфармацыяй і аб супярэчнасцях Беларусі з Расіяй. «Ён (Пампеа — «Зв.») мне сказаў: не хвалюйцеся. Мы Беларусі дапаможам. А яго заява, што па канкурэнтнай цане нафту паставім? ***А мы што просім зараз ад расіян, а яны ў позу сталі і нас на калені спрабуюць паставіць, — канстатаваў Прэзідэнт. — Калі вы не можаце ў Еўразійскім саюзе без пошліны нам паставіць нафту, падатковым манёўрам замянілі, прадайце нам па сусветных цэнах».***

Сутнасць спрэчкі лідар патлумачыў і ў лічбах. Сёння барэль нафты каштуе 55 долараў. Расійскія партнёры просяць даплаціць яшчэ 12 долараў за тону як прэмію кампаніям. Пры гэтым на Захад паліва ідзе без такіх надбавак. Узгадаем і крэдыты: амерыканцы плацяць расіянам 1,5 працэнта, а мы ад 4 да 6 працэнтаў.

«Шчасце» нам падарылі. Мільярд долараў штогод мы Расіі плацім. Яны выдатна размясцілі свае грошы. Мы цяпер не просім у іх ні крэдытаў, нічога. Давайце будзем супрацоўнічаць», — заклікае беларускі лідар.

***Ён анансаваў сустрэчу з Уладзімірам Пуціным (якая запланавана на 7 лютага) як момант ісціны. «Мы з ім (Пуціным — «Зв.») стварылі гэтыя добрыя адносіны, мы былі архітэктарамі гэтых адносін. Ці нам ламаць іх на зыходзе нашай палітычнай кар'еры?»*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і сказаў, што неабходна новаму пакаленню палітыкаў перадаць годныя двухбаковыя адносіны.

## НЕСАЛОДКАЯ НАВУКА

Адказваючы на пытанне журналіста пра сітуацыю, якая склалася вакол затрымання кіраўнікоў цукровых заводаў краіны, Прэзідэнт сказаў, што даў даручэнне Камітэту дзяржбяспекі праінфармаваць грамадскасць пра тое, што адбываецца.

На мінулым тыдні з'явілася інфармацыя аб затрыманні кіраўнікоў цукровых заводаў, пры гэтым некаторыя СМІ акцэнтавалі ўвагу на заслугах затрыманых. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў узгадаць гісторыю развіцця цукровай галіны. «Мы ўжо шмат гадоў забяспечваем сябе цукрам і амаль столькі ж экспартуем, у асноўным у Расію. Калі была пастаўлена задача павялічыць выраб цукру, мной было прынята рашэнне па мадэрнізацыі заводаў. Гэта пра тое, што ***быццам бы дырэктары правялі мадэрнізацыю заводаў. Малайцы, што правялі, а грошы яны дзе ўзялі? Хто займаўся?*** Я ездзіў да Сі Цзіньпіна, прасіў гэты крэдыт на гэтую фабрыку (па вырабе кардону — «Зв.»). Дакладна гэтаксама і тады. Правялі мадэрнізацыю чатырох заводаў. Пачалі вырабляць канкурэнтаздольны прадукт. Наш цукар па якасці пераўзыходзіць любы цукар у свеце. Гэта значыць, прадукт атрымаў сусветны ўзровень».

«Што зрабілі гэтыя дзялкі? — з горыччу пракаментаваў цяперашнюю сітуацыю Прэзідэнт. — Яны стварылі ў Маскве так званую «пракладку» — гандлёвы дом. Можна было праз канцэрн прадаць на рынку цукар — не, стварылі гэты гандлёвы дом, паставілі туды сваіх (людзей), з гэтых заводаў, скажам, летась, па стратных цэнах прадавалі гандлёваму дому ў Маскве беларускі цукар. Тыя, павялічыўшы цану, прадавалі на рынку. Розніцу хабарам раздавалі дырэктарам заводаў. Але што мяне больш за ўсё абурыла, калі мне далажылі пра гэта пытанне спецслужбы (я кантраляваў): танна прадавалі гандлёваму дому гэты цукар, а частку яго па павялічанай цане вярталі ў Беларусь. Можа, нават не вазілі цукар, а толькі дакументы афармлялі, і тут на наш рынак пастаўлялі з маржой, а потым яе дзялілі на хабары. Што гэта — нармальна?»

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што на гэтымі папаліся і людзі з пагонамі. Ён пацвердзіў, што дзеля затрымання аднаго з падазраваных быў развернуты самалёт, які ўжо выляцеў за межы краіны.

***«Стаўленне будзе жорсткае, — падкрэсліў ён. — Дэталі праваахоўнікі раскажуць. Вы думаеце, мне лёгка «сваіх дзяцей» у турму адправіць? Дырэктары мне як дзеці. Дзеці дзецьмі, але трэба весці нармальную палітыку і не нажывацца на тым, што належыць не толькі працоўнаму калектыву, а ўсяму беларускаму народу.*** Мы нямала туды ўклалі».

На працягу сутак усе падазраваныя былі затрыманы, каб даць паказанні. Прэзідэнт паведаміў, што вобыскі выявілі вялікае багацце ў затрыманых. ***«У мяне ні да каго няма асабістых прэтэнзій, я абараняю інтарэсы дзяржавы.*** І ведаеце, што яшчэ проста прыводзіць у шаленства? Калі ты змагаешся там за гэтую капейку па нафце, па газе, па метале, яшчэ па нечым, тут спрабуеш наладзіць, каб людзі заробкі мелі, гэтыя падонкі нахабна сярод белага дня крадуць! Гэта нармальна? Ненармальна. Таму гэта — навука для ўсіх дырэктараў».

## РЭЦЭПТЫ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ АД ПРЭЗІДЭНТА

Аляксандр Лукашэнка, размаўляючы з журналістамі, даў свае парады па барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса. Мыць рукі, менш абдымацца на вуліцы з незнаёмымі — жартоўна апісаў ён правілы асабістай гігіены.

***«Калі мы не пылім, як некаторыя краіны, якія гвалтам крычаць, — гэта не значыць, што мы не займаемся гэтым пытаннем»***, — звярнуў увагу лідар краіны.

Міністру аховы здароўя даручана займацца пытаннем і інфармаваць грамадства, але не трэба палохаць людзей. «Колькі ў нас ужо было гэтых вірусаў. І на гэтых фэйках у тым ліку і гвалце, якія ўчынілі ва ўсім свеце (я не заніжаю небяспечнасць), але колькі нажываліся! ***Сотні мільярдаў долараў некаторыя кампаніі на гэтым зарабілі. Таму крычаць не трэба, трэба ціха, спакойна працаваць»***, — расказаў пра яшчэ адзін сродак ад каранавіруса Прэзідэнт.

З-за эпідэміі Беларусь не будзе парываць сувязі з Кітаем. Дастаткова агляду тых, хто прылятае, у аэрапорце. Аказаць дапамогу кітайцам, у тым ліку з выездам на месца, прапанавалі медыкі на чале з міністрам Уладзімірам Каранікам.

Прэзідэнт расказаў, чым яму асабліва спадабаліся беларусы ў час распаўсюджання каранавіруса: «Ніхто не пабег хапаць гэтыя маскі, як у Расіі, дзе ў 35 разоў маскі падаражэлі. Нашы спакойна — трэба камусьці, купілі. У кагосьці дома яны заўсёды ёсць. У каго дзеці маленькія — абавязкова гэтыя маскі ёсць. Ніхто не бегае, не мітусіцца. Паводзяць сябе як цывілізаваныя людзі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсяго ў нас дастаткова, каб гарантаваць бяспеку людзей.

***«Калі раптам нешта, мы гэта хаваць не будзем. Ізалюем чалавека і будзем лячыць. Пакуль у нас такіх фактаў не зарэгістравана», — запэўніў Прэзідэнт.***

* * *

Напрыканцы рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць Аляксандр Лукашэнка наведаў Добрушскі фарфоравы завод. Гэты візіт быў не запланаваны, але радасны і чаканы для работнікаў прадпрыемства.

«Вельмі рады, што кіраўнік дзяржавы наведаў наш завод. Асноўнае пытанне, якое падняў Прэзідэнт, — захаваць і, нават, удасканаліць прадпрыемства для падтрымання канкурэнтаздольнасці на рынках — унутраным, еўрапейскім і старацца канкураваць, — расказаў пасля журналістам генеральны дырэктар «Добрушскага фарфоравага завода» Аляксандр Вінакураў. — Кіраўнік краіны таксама звярнуў увагу, што неабходна зрабіць невялікі касметычны рамонт, захоўваць людзей, тэхналогіі і вытворчасць».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Марыя ДАДАЛКА.**
*г. Добруш.*

Супрацоўніцтва

# ГЕРМАНІЯ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ІМПАРЦЕ БЕЛАРУСКІХ ТАВАРАЎ

**Аб гэтым паведаміў старшыня германска-беларускай парламенцкай групы Бундэстага Германіі Марк ХАЎПТМАН на сустрэчы са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Андрэем САВІНЫХ.**


Фота БелТА.

Беларускі парламентарый падкрэсліў: Беларусь разглядае Германію як ключавога партнёра ў Еўрапейскім саюзе. Размова ідзе, у прыватнасці, аб сацыяльных аспектах — досведзе ФРГ па фарміраванні грамадзянскай суполкі, рэалізацыі інтарэсаў розных сацыяльных груп, адзінай праграме развіцця краіны.

«Надзвычайна цікавы германскі вопыт па ўзаемадзеянні бізнесу і грамадства. Германія — першы і галоўны партнёр, асабліва ў галіне мадэрнізацыі эканомікі, паставак высакаякаснага абсталявання», — працытаваў Андрэй Савіных.

Дэпутат бачыць перспектывы для паглыблення прамысловай кааперацыі ў энергетыцы, хімічнай прамысловасці, машына- і прыборабудаванні, развіцці электратранспарту, а таксама ў галіне інфармацыйных тэхналогій.

«Германія зацікаўлена ў падтрымцы інвестыцыйных працэсаў ад нямецкіх фірм на тэрыторыі Беларусі. У той жа меры мы хочам развіваць экспарт беларускіх вырабаў у Германію і ў Еўропу ўвогуле», — у сваю чаргу адзначыў Марк Хаўптман. Журналістам ён паведаміў, што вялікі патэнцыял для супрацоўніцтва бачыць у галінах лічбавізацыі, будаўніцтва сельскагаспадарчай тэхнікі і электратранспарту, лагістыцы.

Андрэй Савіных нагадаў журналістам і пра магчымасць пашырэння ўзаемадзеяння праз вытворчасць кампанентаў для тэхнікі.

«У нас ужо ёсць станоўчы досвед у галіне аўтамабілебудавання. Гэта трэба развіваць і ўсяляк пашыраць гэтую практыку», — выказаў меркаванне дэпутат.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# НАФТА З ЗАХАДУ

***Літва гатова працягваць альтэрнатыўныя пастаўкі ў Беларусь***

**Пасля рэалізацыі пілотных праектаў можна абмяркоўваць транзіт нафты на пастаяннай аснове. Аб гэтым журналістам па выніках сустрэчы з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам МАКЕЕМ паведаміў яго літоўскі калега Лінас ЛІНКЯВІЧУС. Бакі плануюць разглядзець і тэхнічныя магчымасці паставак газу.**


Фота БелТА.

Падчас сустрэчы кіраўнікі ведамстваў закранулі шэраг пытанняў, у тым ліку вострых. Сярод іх — будаўніцтва атамнай электрастанцыі, ацэнкі бяспекі якой разыходзяцца.

«Галоўнае — быць упэўненым, што забяспечана максімальная бяспека пры будаўніцтве, а потым працы АЭС», — сказаў журналістам Уладзімір Макей. У Беларусі разумеюць насцярожанасць літоўскага боку, але, падкрэсліў міністр, наша краіна цалкам празрыстая ў супрацоўніцтве з МАГАТЭ. Так, стрэс-тэсты на новай станцыі праведзены добраахвотна, бо Беларусь, як ніхто, зацікаўлена ў «мірным» атаме.

Уладзімір Макей паведаміў, што разглядае візіт Лінаса Лінкявічуса як аснову новага, якаснага перыяду ў двухбаковых адносінах. Тым больш што шостага лютага спаўняецца 25 гадоў з моманту падпісання дагавора аб добрасуседстве і супрацоўніцтве і дагавора аб дзяржаўнай мяжы паміж краінамі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

На слыху

# Расія эвакуіруе беларусаў з Уханя

**На кітайскі вірус nCov-2019 у Беларусі ўжо абследавана больш за 300 чалавек. Ні ў адным выпадку ён не пацвердзіўся, паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

— У тых, хто прайшоў абследаванне, выяўлены грып тыпаў A і B, мікаплазма, рынавірусы і іншае. На сёння каранавірус у Беларусі не зарэгістраваны, — адзначыла прэс-сакратар.

Яна расказала, што Міністэрства аховы здароўя Беларусі кантактуе з расійскімі калегамі. Усе грамадзяне Беларусі, якія, знаходзячыся ў Кітаі, звязаліся з пасольствам Рэспублікі Беларусь у гэтай краіне і запрасілі эвакуацыю, атрымаюць месцы ў самалёце Расіі. Пакуль гэта дзесяць чалавек.

— Сёння-заўтра беларусаў эвакуіруюць, яны будуць знаходзіцца на каранціне ў Расіі. Пакуль яны адчуваюць сябе здавальняюча і пасля праходжання каранціну вернуцца ў Беларусь, — удакладніла Юлія Барадун.

Як паведамлялася раней, 2 лютага з кітайскага Уханя разам з грамадзянамі Казахстана эвакуіраваны пяць беларусаў. Яны дастаўлены ў Нур-Султан, дзе знаходзяцца ў супрацьінфекцыйным корпусе пры шматпрофільнай бальніцы і застануцца там да зняцця каранціну. Усе яны не маюць прыкмет хваробы. Казахскі бок дапаможа беларусам наладзіць устойлівую сувязь з роднымі. Гэта паабяцаў пасол Беларусі ў Казахстане Анатоль Нічкасаў у тэлефонным размове з міністрам аховы здароўя Уладзімірам Каранікам. Ім перададуць сім-карты мясцовых аператараў сувязі.

Колькасць лятальных зыходаў сярод тых, хто захварэў на пнеўманію, выклікаую каранавірусам nCov-2019 у Кітаі, павялічылася да 425, захварэлі больш за 20 тысяч. За межамі Кітая вірус выяўлены ўжо ў больш чым 20 краінах. Пры гэтым улады КНР заяўляюць, што смяротнасць ад гэтага вірусу ў Кітаі складае 2,1 % ад захварэўшых, і яна значна ніжэйшая, чым смяротнасць ад грыпу, Эболы і вірусу рэспіраторнага сіндрому (MERS). Сапраўды смяротнасць ад так званага «птушынага грыпу» ў 1997 годзе склала 52,8%. У 2002 годзе пры ўспышцы каранавіруса SARS (атыповая пнеўманія) памерла 9,6 % інфіцыраваных. У 2009 годзе грып H1N1 (вядомы як «свіны грып») забраў жыцці 17,4 % захварэўшых. У 2012-м успышка каранавіруса MERS-CoV каштавала жыццяў 34,4 % хворых.

**Алена КРАВЕЦ.**

Грошы

# БЯРЭШ ЧУЖЫЯ, АДДАЕШ СВАЕ

**Беспрацэнтныя банкаўскія растэрміноўкі масава адмяняюцца?**

**Сістэмныя буйныя банкі ўжо змянілі ўмовы продажу тавараў у растэрміноўку. Гэта здарылася пасля таго, як Нацыянальны банк абмежаваў камісійныя, якія фінансавым інстытутам плацілі крамы і цэлыя гандлёвыя сеткі.**



А ўсё пачалося з таго, што банкі сталі эмітаваць карты растэрміноўкі, прапаноўваючы тым самым насельніцтву аплачваць тавары ў крамах часткамі на працягу кароткага ці нават даволі доўгага перыяду часу. Пры гэтым перавага картак растэрміноўкі для пакупнікоў да нядаўняга часу заключалася ў тым, што гэты механізм не прадугледжваў фактычна ніякіх працэнтаў, гэта значыць узнагароджанне банк за карыстанне растэрміноўкай практычна не браў. Але ж так не бывае, каб добры банкір даваў грошы на час за прыгожыя вочы. Свой дадатковы даход банкі ў дадзеным выпадку атрымлівалі ад прадаўцоў, якія выплачвалі ўзнагароджанне крэдытным арганізацыям у выпадку продажу тавараў у растэрміноўку.

Такая «мудрая» схема больш за ўсё спадабалася прадаўцам, выручка якіх пачала расці нават па тых дарагіх пазіцыях, дзе цэны для кліентаў не былі зніжаны нават на капейку. На самай справе, цана тавару рэальна меншая — на тую частку камісійных, якую прадаўцы «адшпільвалі» банкірам. Пакупнікі «без замарочак», з радасцю набывалі такія дарагія тавары, аплачваючы іх часткамі і не пераплачваючы (як ім здавалася) за гэта — хоць менавіта яны плацілі і тыя самыя камісійныя. Быццам бы ўсе задаволеныя, але ... Дадзеная мадэль продажаў не спадабалася Нацыянальнаму банку краіны.

А таму фінансавы рэгулятар яшчэ ў студзені разаслаў камерцыйным банкам лісты і папярэдзіў аб недапушчальнасці завышаных узнагароджанняў, якія гэтыя арганізацыі бяруць у прадаўцоў у выпадку продажу тавару ў растэрміноўку. Высветлілася, што часам крамы выплачваюць да 30 % ад кошту тавару ў выпадку афармлення пакупкі ў растэрміноўку. Нацбанк жа рэкамендаваў знізіць да 4 % памер любога ўзнагароджання, якое выплачваюць банкам арганізацыі гандлю. Банкі павінны выканаць прадпісанне Нацбанка і да 8 лютага даць справаздачу аб праведзенай рабоце.

Крэдытныя арганізацыі ўжо пачалі выконваць указанні рэгулятара. Паколькі цяпер магчымасці банкаў спаганяць узнагароджанне з арганізацый гандлю абмежаваныя, фінансавыя ўстановы перагледзяць умовы прадастаўлення растэрміновак і сталі адмаўляцца ад беспрацэнтных варыянтаў. Некаторыя банкі сталі спаганяць ад 4 % да 6 % гадавых з насельніцтва ў выпадку афармлення растэрміноўкі больш чым на шэсць месяцаў. Беларусбанк і зусім адмовіўся ад прадукту «растэрміноўка без пераплат».

Аналітыкі Нацбанка ўпэўненыя — не варта ствараць умовы, каб уся краіна жыла ў растэрміноўку. Бо ў некаторых слаёў насельніцтва нярэдка можа стварацца ілюзія, што тавары ў растэрміноўку прадаюцца амаль бясплатна, паколькі іх купля не патрабуе ні першапачатковых плацяжоў, ні працэнтных выплат. Аднак у рэчаіснасці афармленне тавару ў растэрміноўку вядзе да павелічэння пазыковай нагрузкі на хатнюю гаспадарку.

Тыя сем'і, якія кожны месяц бяруць тавары ў растэрміноўку, могуць сутыкнуцца з непад'ёмным памерам пазыковай нагрузкі. Калі чалавек купляе тавар у растэрміноўку ў краме, а не бярэ крэдыт у банку, ацаніць плацежаздольнасць такога кліента праблематычна. Трэба, пры неабходнасці, набываць у растэрміноўку толькі адзін тавар, а наступныя пакупкі рабіць толькі пасля таго, як папярэдняя растэрміноўка скончыцца. Але не ўсе прытрымліваюцца такога правіла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп перамог на кокусах у Аёве



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп атрымаў перамогу на кокусах у штаце Аёва, паведаміла мясцовае падраздзяленне Рэспубліканскай партыі. Як паведамляе выданне USA Today, Трампу ўдалося набраць 97,2 % галасоў выбаршчыкаў, у той час як былы губернатар штата Масачусетс Уільям Уэлд набраў усяго 1,3 % і апынуўся на другім месцы.

Сам Трамп у «Твітэры» назваў свой вынік вялікай перамогай і падзякаваў за яго сваім прыхільнікам. Кокусы, як і праймерыз — частка ўнутрыпартыйных выбараў у ЗША, па выніках якіх ад партыі абіраецца кандыдат у прэзідэнты ЗША. Гэта мясцовыя партыйныя сходы, удзельнікі якіх выбіраюць дэлегатаў — сваіх прадстаўнікоў. Улетку перад выбарамі кожная партыя праводзіць нацыянальны з'езд, на якім ужо самі дэлегаты выбіраюць прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта ад партыі. У Аёве традыцыйна праводзяцца першыя ўнутрыпартыйныя сходы, таму іх вынікам удзяляецца такая павышаная ўвага.

## Восем кандыдатаў падалі заяўкі на ўдзел у выбарах прэзідэнта Балівіі

Вышэйшы выбарчы суд (ВВС) Балівіі прыняў восем заявак кандыдатаў на ўдзел у выбарах прэзідэнта краіны. Аб гэтым паведаміў старшыня інстанцыі Сальвадор Рамэра. «Чатыры альянсы і чатыры партыі зарэгістраваліся. У нас ёсць тыдзень, каб праверыць дакументы кандыдатаў», — сказаў ён на прэс-канферэнцыі, якая транслiравалася ў Facebook газеты Deber. Калі ў ВВС будуць заўвагі да дакументаў, у партый будзе магчымасць іх выправіць. 23 лютага павінен быць апублікаваны канчатковы спіс асоб, дапушчаных да ўдзелу ў выбарах, якія запланаваныя на 3 мая.

## Google ўпершыню раскрыла выручку YouTube




Кампанія агучыла звесткі аб выручцы відэахостынгу YouTube ў справаздачнасці за чацвёрты квартал мінулага года. Падобнае адбываецца ўпершыню ў гісторыі, адзначае CNBC. Пры гэтым даходы YouTube з іншых крыніц асобна не пазначаны, што робіць ацэнку рэальнага прыбытку сэрвісу складанай задачай, падкрэслівае тэлеканал. Рэклама на YouTube ў 2019 годзе прынесла кампаніі Google каля $15,15 млрд. На чацвёрты квартал прыпадае $4,72 млрд выручкі. У 2018-м на рэкламе кампанія зарабіла каля $11,16 млрд. Прадстаўнік Google адмовіўся паведаміць CNBC, якую долю выручкі ад рэкламы на YouTube атрымліваюць стваральнікі відэакантэнту. Аднак фінансавы дырэктар кампаніі Рут Порэт паведамляла, што ім сыходзіць «вялікая частка» гэтых грошай, адзначае тэлеканал.

«Гарачае» пытанне

# НЕСПАКОЙ ДЛЯ РАПСУ

## Зімуючыя культуры вытрымалі цёплую зіму, але ці вытрымаюць маразы?

**Анамальна цёплая, маласнежная зіма хвалюе сваёй нетыповасцю многіх людзей, у тым ліку і аграрыяў. Як пры такіх умовах адчуваюць сябе азімыя культуры?**

— Зазелянелыя на палях азімыя культуры ў халодную пару — такое ў Беларусі ўжо было. Так, зімой 2006—2007 гадоў слабая вегетацыя азімых працягвалася да сярэдзіны студзеня. У далейшым, прыблізна на месяц, усталявалася зіма з даволі адчувальнымі маразамі і снежным покрывам, — расказала **начальнік аддзела агламетэаралогіі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролю радыяцыйнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Надзея МЕЛЬЧАКОВА.**

Што датычыцца сёлетняй зімоўкі, то, як мяркуюць спецыялісты-кліматолагі, зіма 2019—2020 гадоў можа стаць самай цёплай за ўвесь перыяд метэаралагічных назіранняў. Вялікая імавернасць і таго, што цяперашняя зіма будзе адна з самых маласнежных ці нават самая маласнежная. Невялікае снежнае покрыва ўтваралася за гэтыя месяцы некалькі разоў, але ўтрымлівалася кароткі час.

Паводле слоў Надзеі Мельчаковай, незвычайна цёплае надвор'е не дазволіла азімым культурам перайсці ў стан глыбокага фізіялагічнага спакою. Глеба заставалася талая, ці падмярзаў толькі верхні яе слой. А вось тэмпература глебы на глыбіні залягання вузла кушчэння азімых збожжавых культур была пераважна блізкая да нуля і слабаплюсавая. Пад уплывам такіх агламетэаралагічных умоў расліны трацілі загартоўку. Пры гэтым небяспечных нізкіх тэмператур, якія маглі б выклікаць пашкоджанні раслін, на тэрыторыі краіны тады не назіралася.

У канцы студзеня асобныя падраздзяленні Белгідрамета правялі адгадоўванне азімых культур, каб вызначыць іх жыццядольнасць. Па яго выніках каля 90 % проб азімых збожжавых культур і рапсу далі поўнае адрастанне. У астатніх пробах спецыялісты адзначылі нязначную зрэджанасць (менш за 10 % раслін), што лічыцца натуральнай гібеллю. Пры гэтым шматгадовыя травы (канюшына, люцэрна) ва ўсіх адабраных узорах адраслі цалкам.



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

— Мінулай восенню азімыя збожжавыя культуры спынілі вегетацыю на большасці плошчаў у фазе кушчэння, — адзначыла Надзея Віталеўна. — Аднак позняя кастрычніцкія пасевы не паспелі раскусціцца. У далейшым у анамальна цёплыя перыяды ў іх назіралася слабапраяўная вегетацыя. Па апошніх звестках амаль на ўсіх назіраных палях з позніміі тэрмінамі сяўбы азімыя збожжавыя пачалі кусціцца.

Згодна з прагнозам сіноптыкаў, у сярэдзіне бягучага тыдня на тэрыторыі краіны пахаладае. Тэмпературны рэжым наблізіцца да кліматычнай нормы. Уначы тэмпература паветра будзе паніжацца да 2—9 градусаў ніжэй за нуль, у асобных раёнах пры працяглых праясненнях — да -10...-15 °С. Агрометэаролаг запэўніла, што такія маразы для большасці зімуючых культур не нясуць небяспекі. Пры паступовым паніжэнні тэмпературы расліны аднаўляюць марозаўстойлівасць. Акрамя таго, на палях павінна ўтварыцца невялікае снежнае покрыва. Калі ж тэмпература панізіцца да -14...-15 °С, могуць узнікнуць апасенні за зімовы рапс як найменш марозаўстойлівую культуру. Але ёсць надзея, што яны не спраўдзяцца, тым больш што, па папярэдніх ацэнках сіноптыкаў, пахаладанне чакаецца кароткатэрміновае.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

А не шкодзь!

# У лес з самаробнымі стрэльбай і пісталетам

**Не з'яўляючыся паляўнічым, грамадзянін меў чатыры адзінкі зброі. Уладальніка «джэнтльменскага» набору затрымалі падчас браканьерскага промыслу ў Шчучынскім раёне супрацоўнікі Мастоўскай міжрайінспекцыі і мясцовы егер, які паведаміў пра начныя стрэлы.**

Паляўнічы-нелегал хадзіў па ўгоддзях і быў узброены самаробнай стрэльбай, прыстасаванай для стральбы кулямі, якія запраўляліся ў барабан, разлічаны на дзесяць зарадаў. У момант затрымання ў ім знаходзіліся чатыры зарады. Каб паляванне было паспяховым, сваю зброю вынаходлівы парушальнік абсталяваў аптычным прыцэлам і лазерным паказальнікам. Не забыўся ўзяць і прыбор начнога бачання, а для раздзелкі і транспарціроўкі дзічыны прыхапіў нож, сякеру, вяроўкі, ланцуг з кручкамі і мяхі.

Пры аглядзе навакольляў недалёка ад месца затрымання інспектары знайшлі яшчэ і зараджаны самаробны пісталет, ад якога паспяшаўся пазбавіцца браканьер. Яго канструкцыя аказалася таксама вельмі незвычайнай: устаўляць кулю і парахавы зарад трэба было непасрэдна праз дула.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, затрыманы 42-гадовы мужчына родам з вёскі Новы Двор, побач з якой і паляваў, жыве і працуе ў Гродне. У тую ноч падстрэліць жывёл ён не паспеў, аднак дома ў парушальніка выявілі рогі трафейнага аленя і 13 кілаграмаў мяса. Якой жывёле яно належыць, высвятліць экспертыза.

У дадатак да канфіскаванай самаробнай зброі дома ў гродзенца знайшлі яшчэ незарэгістраваную гладкаствольную стрэльбу і пнеўматычную вінтоўку з оптыкай, 152 патроны да малакаліберный вінтоўкі і каля 500 грамаў пораху. Прыцягнула ўвагу яшчэ адно выяўленае прыстасаванне — так званая «кулялейка». З дапамогай спецыяльных металічных формачак мужчына, відавочна, выраблаў кулі для самаробнай зброі.

Незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў, а менавіта — іх выраб, набыццё, перадача ў валоданне, збыт, захоўванне, перавозка, перасылка або нашэнне — з'яўляюцца сур'ёзным злачынствам. Гарадзенцу пагражае крымінальная адказнасць. Мінімальнае пакаранне — папраўчыя работы на тэрмін да двух гадоў, максімальнае — пазбаўленне волі на тэрмін да сямі гадоў са штрафам.

За знаходжанне ў паляўнічых угоддзях са зброяй без дазвольных дакументаў дзяржінспектары пачалі ў дачыненні да браканьера адміністрацыйны працэс. Ці паляваў ён раней і ці здабываў жывёл — высветліць следства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ваша права

# ЛІГА СЯМЕЙНЫХ МЕДЫЯТАРАЎ

## дапаможа разабрацца ў стасунках з дзецьмі, нерухомасцю, спадчынай...

**Амаль палова шлюбаў у Беларусі, на жаль, распадаецца. Прычым у пераважнай колькасці такіх сямей ёсць непаўналетнія, і ў былых сужэнцаў часта пачынаюцца сваркі наконт падзелу маёмасці і выхавання малых. Гэтыя і іншыя рознагалоссі, якія ўзнікаюць у сямейных стасунках, нават і без разводу пары, можна вырашаць бяскрыўдна і цывілізавана, запэўніваюць медыятары.**

Спрэчкі ў сямейнай медыяцыі самыя складаныя, таму што яны замешаны на мностве эмоцый, крыўдаў, абраз паміж самымі блізкімі людзьмі. Вытрываць гэта бывае цяжка нават самому медыятару.

— Для любога сур'ёзнага рашэння павінны надысці адпаведны час і сфарміравацца кола аднадумцаў. Шэсць гадоў таму, 24 студзеня 2014-га, у Беларусі ўступіў у сілу закон аб медыяцыі. У найбліжэйшы час уступяць у сілу новыя змены ў заканадаўстве — у тым ліку ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і і Грамадска-працэсуальны кодэкс па пытаннях, якія звязаны са шлюбна-сямейнымі адносінамі і медыяцыяй. І, пэўна, наспеў час і для аб'яднання самых кваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць у сферы сямейнай медыяцыі, маюць вопыт работы з парамі і дадатковую адукацыю, — упэўнена **Алена СЦЯПАНАВА, адвакат, медыятар Цэнтра медыяцыі і перагавораў, старшыня аб'яднання «Беларуская Ліга сямейных медыятараў», якое нядаўна было зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі.**

Прафесійная суполка мае мэтай садзейнічаць развіццю і ўмацаванню інстытута сямейнай медыяцыі ў краіне, павышаць якасць работы сямейных медыятараў і ролю сямейнай медыяцыі ў грамадстве. А таксама праводзіць дадатковую адукацыю, фарміраваць умовы для практычнага развіцця спецыялістаў, ствараць пляцоўкі, дзе практыкі могуць дзяліцца вопытам.

— Важна, каб пры скасаванні шлюбу людзі ўзважана падыходзілі да гэтага пытання і разыходзіліся толькі тады, калі сям'ю сапраўды немагчыма вyратаваць, — падкрэсліла медыятар. — Мы будзем актыўна наладжваць работу з усімі органамі, якія маюць дачыненне да сямейных спрэчак: судамі, упраўленнямі адукацыі, загсамі. Каб іх супрацоўнікі раілі людзям па праблемных пытаннях звяртацца не да пэўнага медыятара, а да нас у арганізацыю, дзе працуюць кваліфікаваныя прафесійныя спецыялісты, якія сапраўды эфектыўна дапамогуць.

Выгадныя для ўсіх рашэнні найчасцей нараджаюцца ў досыць камфортных стасунках за сталом перамоў, а не ў стрэсавай сітуацыі ў афіцыйнай зале суда. Медыяцыя дазваляе варожым бакам пачуць адно аднаго і зразумець, што часта канфлікцёры думаюць аднолькава, толькі кажуць пра гэта па-рознаму.

**Ірына СІДАРОК.**

Эканамікс

# АД НАВУКІ ДА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА — АДЗІН КРОК

## Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя адзначыла 30-годдзе

**Спецыяльна да юбілею прымеркавалі канферэнцыю «30 гадоў БНПА. Дзелавы клімат Беларусі: шчыра пра перспектывы», якая адбылася ў велічным мінскім «Прэзідэнт-Атэлі». Колькасць высокіх гасцей, сярод якіх былі прадстаўнікі ўрада, вядомыя прамыслоўцы і навукоўцы, як і кола тэм сустрэчы, поўнасцю адпавядала статусу месца правядзення.**

**Намеснік міністра эканомікі Беларусі Дзмітрый МАТУСЕВІЧ** адзначыў вялікую ролю БНПА ў дыялогу бізнесу і ўлады: «Гэта асацыяцыя з тых, што рэальна ўплываюць на фарміраванне экспертнага меркавання дзяржаўных органаў і арганізацый. У прыватнасці, на пляцоўцы Міністэрства эканомікі праводзяцца рэгулярныя сустрэчы з членамі асацыяцыі па пытаннях, якія выносяцца на класічны наш грамадска-кансультацыйны савет, і па тэматычных кірунках».

Вынікам супрацоўніцтва грамадскіх арганізацый (сярод якіх была і БНПА) і міністэрства стала стратэгія развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Беларусі і яе план. Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя, па словах Дзмітрыя Матусевіча, — незаменны элемент у пошуку балансу паміж рэгулятарамі (уладамі) і жаданнямі бізнесу. Выконваюць прамыслоўцы і сваю класічную задачу — развіццё эканомікі.

«Той сплаў вопыту, які ёсць у Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі, важны для прыняцця кіраўнічых рашэнняў на канкрэтных прадпрыемствах, — сказаў намеснік міністра. — Крайне важна і ў гэтым годзе, і асабліва ў будучай пяцігодцы развіваць сферу паслуг. Таму экспертыза — якія паслугі можна развіць з улікам таго, што яны значна менш імпартаёмістыя, з улікам нашага кадравага патэнцыялу, — гэта перш за ўсё павінна зыходзіць ад бізнесу».

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ** адзначыў, што асацыяцыі ўласцівая дыскусія, якая не разбурыла, а, наадварот, узмацніла і павысіла статус аб'яднання.

Карыстаючыся фарматам сустрэчы і яе тэматыкай, Уладзімір Калтовіч расказаў, што МАРГ распрацавала праграму развіцця канкурэнцыі ў Рэспубліцы Беларусь: «Мы два гады працавалі над гэтай праграмай з усімі дзяржаўнымі органамі. У нас ёсць пагадненне з Міжнароднай фінансавай карпарацыяй па напісанні гэтай праграмы. Праект гэтай праграмы мы разаслалі дзяржаўным органам на ўзгадненне».

Уладзімір Калтовіч, выконваючы даручэнне Савета Міністраў, уручыў Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі Ганаровую грамату ўрада за шматгадовую плённую грамадскую дзейнасць у сферы развіцця прамысловасці і прадпрымальніцтва.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя» заснавана з ініцыятывы кіраўнікоў вядучых прадпрыемстваў як інструмент захавання партнёрскіх сувязяў, выпрацоўкі прамысловай, навукова-тэхнічнай і маркетынгавай палітыкі. Сёння асацыяцыя яднае каля 650 прамыслоўцаў, прадпрымальнікаў і навукоўцаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Кантакт

# МАКАЁНАК НА МАРЦЫ

Сёлета спаўняецца сто гадоў з дня нараджэння славутага беларускага драматурга, народнага пісьменніка БССР Андрэя Макаёнка. Да юбілею творцы Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі выпускае ў абарачэнне адпаведную паштовую марку. Пра гэта паведамляе «Белпошта».




Дызайн маркі распрацавала Алена Мядзведзь, мастак — Тацццяна Дольская.

Намінал «Н» адпавядае тарыфу на перасылку міжнароднай простай непрыярытэтнай паштовай карткі. Марка друкавалася ў Бабруйскай узбуйненай друкарні імя А. Т. Непагодзіна. Тыраж яе складзе 35 тысяч.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Мазгавы штурм

# ШКОЛА...ВА ЎМОВАХ ПОЎНАЙ СВАБОДЫ

## Якая б яна была, калі б гэта залежала ад настаўнікаў?

**Ці ведаеце вы, што такое энергія яркіх людзей? Гэта рэальная сіла, якая збівае з ног і натхняе. Менавіта такія людзі сабраліся суботняй раніцай, у свой выхадны дзень, на першы адукацыйны бранч. Ініцыятарамі серыі нефармальных сустрэч педагогаў сталі сузаснавальнік акадэміі крэатыўных тэхналогій IT Princess і прыватнай школы STEAM, выкладчык, ментар Валянціна ЧЭКАН і кіраўнік IT-школы Myfreedom, архітэктар адукацыйных сістэм, адукатар Яўген ЛУФЕРЧЫК.**



### ВАЧЫМА ВУЧНЯЎ

— Адразу скажам, што мы нікога не прадстаўляем. У нас на дваіх вельмі шмат педагагічных гіпотэз, але дыскутаваць удваіх — гэта сумна, — кажуць яны. — Вось таму мы і вырашылі запрасіць неабыякавых людзей, каб «пакруціць» розныя пытанні, звязаныя з адукацыяй. «Адукацыйны працэс у школе: што можна было б зрабіць, калі б можна было рабіць усё?» — менавіта так гучыць тэма нашай першай сустрэчы. Шчыра кажучы, у суботу раніцай менш за ўсё хацелася б чуць ныццё. Не варта думаць, што з'явяцца новы міністр, новы дырэктар у школе, новы начальнік упраўлення адукацыі, новы мэр, новыя дзеці і іх бацькі — і ўсё адразу наладзіцца. Толькі ад кожнага з нас залежыць, як мы працуем, якія мэты ставім, якімі інструментамі карыстаемся і якія каштоўнасці транслюем дзецям.

Усім было прапанавана сфармуляваць запыт, з якім яны прыйшлі на сустрэчу. «Даведацца, што рэальна ў сілах педагогаў і што яны могуць зрабіць ва ўмовах поўнай свабоды...», «Хачу знайсці людзей, гатовых на разрыў шаблонаў, на выхад з зоны камфорту, гатовых штосьці рабіць, а не толькі абмяркоўваць», «Знайсці зацікаўленых калег для рэалізацыі далейшых праектаў у сферы адукацыі», — адказвалі педагогі. «Зразумець, у які бок рухаецца сістэма адукацыі», «Даведацца, як адмесці ў працэсе навучання лішняе», «Даведацца, як прымусіць вышэйшых адміністратараў не лезці ў справы настаўнікаў», «Як абудзіць у дзецях інтарэс да вывучэння новага», «Як убудаваць сучасныя падыходы ў жорсткую структуру школьнай адукацыі»...

Дарэчы, запрашэнне на сустрэчу зацікавіла не толькі педагогаў (як дзяржаўных, так і недзяржаўных устаноў адукацыі), але і прадстаўнікоў бацькоўскай грамадскасці, якія, як прызналіся, нечакана ўбачылі школу зусім па-іншаму. Праўда, і ў настаўнікаў была магчымасць убачыць сваю працу з іншага боку, напрыклад вачыма вучняў. Ім прапанавалі сфармуляваць бачанне вучэбнага працэсу ад імя сваіх выхаванцаў. І высветлілася, што праблема нумар адзін — «на ўроку мне сумна, я не слухаю настаўніка, мне хочацца балбатаць, гуляць, тузаць суседак за коскі». Ва ўсякім разе, так думаюць педагогі. Праблема нумар два — «мне страшна». Я баюся, калі мяне выклікаюць, баюся памыліцца, бо за памылкі караюць. Я адчуваю небяспеку з боку і аднакласнікаў, і настаўніка. Баюся выдзяліцца сярод іншых... Настаўнік у мяне не верыць, і, як вынік, або агрэсія ў бок апошняга, або, наадварот, пасіўнасць на ўроку. Ну і адказ, з якім пагадзіліся ўсе: «Мяне прымушаюць вучыцца (незразумела, навошта мне гэта ўсё), занадта шмат даюць непатрэбнай інфармацыі, у мяне ад вучобы ўвогуле не застаецца вольнага часу, я нічога не паспяваю». Пад гэтым падпішуцца, напэўна, 99 працэнтаў старшакласнікаў... Геніяльная думка: школа — гэта пра выжыванне! Наш мозг не прызначаны для вучобы, ён прызначэнне — выжыванне...

> **Бранч (Brunch) — гэта гібрыд англійскіх слоў «Breakfast» (сняданак) і «Lunch» (абед). Азначае позні сняданак, які плаўна пераходзіць у абед, прычым не дома, а дзе-небудзь у кавярні.**

### ЯКАЯ ТВОРЧАСЦЬ?

Цікава, што **праблемы з матывацыяй ёсць і ў саміх настаўнікаў,** таму што працаваць ім даводзіцца ў рэжыме шматзадачнасці. Падтрымкі не адчуваецца ні з боку адміністрацыі, ні з боку бацькоў вучняў. Больш таго, самі настаўнікі канстатуюць, што **часцяком мае месца педагагічны булінг з боку калег і цкаванне з боку адміністрацыі,** у дэматывуючым асяроддзі складана працаваць, а папярэдні негатыўны вопыт назаўсёды адбівае жаданне праяўляць ініцыятыву. Як вынік — праблемы са здароўем, стрэс, якія пераходзіць ў дэпрэсію, расчараванне ў рабоце і хуткае прафесійнае выгаранне. Дарэчы, разбалансіроўка жыццёвых інтарэсаў і вельмі моцны фокус на працу таксама прыводзяць да выгарання.

На якіх яшчэ праблемах у сваёй дзейнасці спыніліся педагогі? Гэта змест праграм: іх перагружанасць і недахопы, адарванасць адукацыі ад жыццёвых прыярытэтаў навучэнцаў і сацыяльна-эканамічных запытаў грамадства. Празмерная цэнтралізацыя і рэгуляванне вучэбнага працэсу. Абмежаванні ў выбары сучасных метадаў не дазваляюць дасягнуць высокай якасці ведаў, перашкаджаюць раскрываць здольнасці дзяцей. «Састарэлыя формы работы прыводзяць да таго, што мы не фарміруем у вучняў вельмі актуальныя мяккія (сацыяльныя) навыкі, — канстатуюць педагогі. — Калі раней вучоба зводзілася да механічнага завучвання, а паслухмянасць і выкананне задач па ўзоры лічыліся прыкметай добрага вучня, то сёння такія формы работы вядуць у нікуды. **Недавер да настаўніка, строгія стандарты і пастаянны кантроль прыводзяць маладых педагогаў да расчаравання ў прафесіі, а ў іх больш сталых калег застаецца толькі адно жаданне — не высоўвацца і не прыцягваць да сябе ўвагу...** Нізкія заробкі прымушаюць настаўніка браць шмат гадзін нагрузкі: калі ты замест 18 урокаў даеш за тыдзень 40, што атрымліваецца на выхадзе? Няма ні часу, ні сіл ні на творчасць, ні на прафесійнае ўдасканаленне. Зноў-такі, колькасць дзяцей у класе: чым больш дзяцей, тым менш увагі можна ўдзяліць кожнаму вучню. Падзяліце 45 хвілін на 15 або на 30 вучняў».

Не задавальняюць настаўнікаў састарэлая мадэль арганізацыі працэсу навучання, адсутнасць інтэграваных урокаў. Кожныя 45 хвілін вучні вымушаны хутка пераключацца з матэматыкі на гісторыю, з рускай літаратуры на беларускую, з замежнай мовы на фізіку і гэтак далей. Патрабаванні ў школе заніжаны ў параўнанні з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да студэнтаў у ВНУ, таксама і пяцікласнікам даводзіцца складана, таму што ў пачатковай школе да іх былі зусім іншыя патрабаванні.

Слабае месца педагагаў — іх галасавая падрыхтоўка. Голас — асноўны рабочы інструмент, вось толькі як яго зберагчы, у педуніверсітэце не вучаць. А чаму сацыяльна псіхалагічная служба займаецца толькі дзецьмі? Настаўнікі лічаць, што ў школе павінен быць псіхолаг, які будзе займацца «разрульваннем» самых розных сітуацый, у тым ліку па ўзаемадзеянні настаўнікаў з вучнямі і калегамі.

Ну а фраза з боку адміністрацыі «Зрабіце гэта за кошт свайго педагагічнага майстэрства» азначае толькі адно: што ты, ахвяруючы сваім часам і сіламі, павінен заткнуць прабоіны, якія ўзніклі з-за няўмелага кіравання караблём, цябе проста робяць крайнім.

Дасталася ад педагогаў і дзеючай сістэме праверкі ведаў. Чаго толькі варта «песня» адміністрацыі «ніжэй за «тройку» мы ў школе не ставім». Дзесяцібальная сістэма не працуе. Ацэнка не адпавядае мэтам навучання, адсутнічае празрыстасць у яе прымяненні, дзейнічаюць двайныя стандарты, калі «дзясятку» можна атрымаць, напрыклад, за падрыхтаваны рэферат або проста за наведванне спартыўнага мерапрыемства.

### ПАСТАВІЎ ДЫЯГНАЗ — ЛЯЧЫ!

**А цяпер пра ідэальную школу, у якой усім хацелася б працаваць. Пасля агульнага мазгавога штурму атрымалася прыкладна такая карціна.**

Гэта школа, у якой адмовіліся ад публічнага ацэньвання, ад ацэньвання ў лічбах на карысць зваротнай сувязі ад настаўніка. Праз каментарый педагог паказвае моцныя бакі вучня, яго прагрэс не ў параўнанні з іншымі, а з самім сабой, прабелы ў засваенні матэрыялу, дае рэкамендацыі, як іх выправіць. Зваротная сувязь заахвочвае да далейшай работы над сабой. Навучанне не можа быць эфектыўным, калі пазбавіць дзіця нават шанцу на поспех. І зусім іншая справа, калі поспехі прызнаюцца і ацэньваюцца. Галоўнай становіцца не адзнака, а ацэнка яго дзейнасці. Значэнне мае не тое, колькі балаў ты атрымаў на ўроку, а тое, чаму навучыўся. Знікае страх перад выстаўленнем адзнакі. Вучні не баяцца памыліцца, таму што вучобы без памылак не бывае.

У школах адмаўляюцца ад класна-ўрочнай сістэмы. Акцэнт робіцца на мультыдысцыплінарнасць, праектнае навучанне з інтэграцыяй розных прадметаў (кшталту вывучэння феноменаў у фінскай школе), камандную работу і нефармальную арганізацыю вучэбнага працэсу. Можна два дні вывучаць, напрыклад, матэматыку, інфарматыку і фізіку, а потым два дні прысвяціць вывучэнню гуманітарных прадметаў. Дзецям не давядзецца пастаянна пераключацца, гэта зусім іншыя энергавыдаткі, ды і аб'ёмы дамашніх заданняў зменшацца. У школьнікаў з'яўляецца магчымасць выбіраць вучэбныя дысцыпліны і фарміраваць індывідуальны навучальны план. Змяняецца і фізічная прастора школы. Інтэр'еры ствараюцца па прынцыпе мабільнай прасторы і ўключанасці ўсіх у навучальны працэс. Дзеці не глядзяць у класе ў патыліцы адно аднаму.

Сістэма адукацыі бачыць кожнага вучня з яго мэтамі, цяжкасцямі, асаблівасцямі і інтарэсамі.

У вучэбным плане з'яўляюцца прадметы і дысцыпліны, неабходныя для выжывання ў сучасным свеце. Педагогі вучаць, як граматна карыстацца інфармацыяй у лічбавым свеце. Развіваюць у вучняў эмацыянальны інтэлект. Настаўнікі свабодныя ў выбары падручнікаў, метадаў і інструментаў для навучання.

Кантралюючыя органы таксама павінны змяніць прынцыпы сваёй работы. Калі камісія праверыла школу і знайшла там нейкія недахопы, гэтая структура павінна стварыць з прафесіяналаў «спецназ», які прыйдзе ў гэтую школу і пакажа, як трэба працаваць, а потым будзе яе курыраваць. Цяпер жа функцыя правяраючых зводзіцца толькі да таго, каб прыйсці і пакараць, але гэта толькі перашкаджае рабоце. Калі паставіў дыягназ — лячы!

**Беларуская мова зойме ў «школе мары» сваё пачэснае месца.** «Чаму большасць сказаў для практыкаванняў пра прыроду, надвор'е і рыбалку? Колькі можна пісаць у падручніках па беларускай мове «пайшоў дождждык, і вожык схаваўся пад дрэвам»? Дзіця марнуе дзясяткі гадзін, выконваючы заданні, якія не нясуць ніякай інфармацыйнай нагрузкі, адбываецца нейкая інтэлектуальная выпусташанасць. Чаму не практыкаваць родную мову на прыкладах актуальнага словаўжывання, каб дзеткі потым маглі скарыстаць набытае? Дзе ў праграме кнігі і прыклады, якія спрыяюць развіццю асобы, рухаюць дзяцей наперад?» — разважае **выкладчык англійскай мовы Валянціна ГОЛУБЕВА.**

Педагагічная адукацыя даецца студэнтам на беларускай мове. У дакументазвароце таксама выкарыстоўваецца родная мова. Сама менеі гісторыя Беларусі, прадмет «Мая радзіма — Беларусь», мастацкая культура выкладаюцца на беларускай мове. Гэта таксама з пажаданняў...

Тры гадзіны мазгавога штурму праляцелі імгненна.

— Спадзяюся, што хтосьці з вас пераканаўся ў асабістых гіпотэзах, але не выключаю, што нехта пойдзе з нашай сустрэчы з яшчэ большай колькасцю пытанняў, — падвёў вынікі першага адукацыйнага бранча Яўген Луферчык.

— Для мяне адным са стымулаў завітаць сюды было жаданне трапіць у атмасферу аднадумцаў, — канстатаваў **настаўнік матэматыкі цэнтра дадатковай адукацыі «Адукацыйная прастора «Краіна сяброў», аўтар праекта «Па той бок лікаў» Ягор ДАЎГАЛЕВЕЦ,** — таму што калі табе штодня кажуць, што ты дурань, то пачынаеш у гэта верыць. А тут прыйшоў, паглядзеў, пакантактаваў з калегамі і разумееш: з табой насамрэч усё нармальна. Гэта дарагога каштуе.

— Калі на такія сустрэчы не могуць прыйсці тыя ці іншыя настаўнікі і адміністрацыя, то могуць прыйсці неабыякавыя бацькі. І калі мы нараджаем штосьці светлае і добрае, то можна дзейнічаць праз іх, няхай яны нясуць гэтыя ідэі ў свае школы, — прапанавала **настаўнік інфарматыкі Яўгенія ГУШЧЫНА.**

8 лютага на абмеркаванне ў нефармальнай абстаноўцы выносіцца тэма «Методыкі і філасофія адукацыйнага працэсу: ці адчуваем мы розніцу?». 22 лютага ў цэнтры ўвагі будуць настаўніцкая этыка, рызыкі і вырашэнне канфліктных сітуацый. Ацэньванне і матывацыю (ці можна паставіць паміж імі знак роўнасці) педагагічная супольнасць абмяркуе 14 сакавіка.

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.**

Прыклад для пераймання

# ЯК ВЫРАСЦІЦЬ ЧЫТАЧА,

або Калі галоўны герой — кніга

**Для папулярызацыі чытання дзецьмі і моладдзю ў краіне праводзіцца шмат мерапрыемстваў. Пра гэта расказаў начальнік упраўлення маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ.**

— Сярод іх — даследаванні па гэтай тэме. Па выніках апошняга высветлілася, што адзін з галоўных фактараў, па якім вызначаецца, чытае дзіця ці не, — наяўнасць кніг у хатняй бібліятэцы. Малым вельмі важна бачыць бацькоўскі прыклад. Варта адзначыць, што калі ў твора захапляльны сюжэт, ён цікавы, то попытам у хлопчыкаў і дзяўчынак карыстацца будзе.

**Дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Іван САВЕРЧАНКА** перакананы: выхоўваць маладое пакаленне трэба на творах Кандрата Крапівы, Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых беларускіх творцаў, прывіваць яму цікавасць да нацыянальнай і самабытнай культуры, любоў да беларускай мовы.

— Дзеці павінны шмат чытаць разнапланавых і якасных кніг. А для гэтага ў краіне створаны ўсе ўмовы. Наш Інстытут перавыдае зборы твораў беларускіх класікаў, дапаўняючы іх раней невядомымі шэдэўрамі: ужо ўбачылі свет 19 тамоў з 50. Мы ўдзельнічаем у рэалізацыі праграмы па падтрымцы сацыяльна значнай літаратуры: так выданні адпраўляюцца ў школьныя бібліятэкі ў розныя гарады і вёскі.

З ініцыятывы Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі ў краіне былі скарэкціраваны навучальныя праграмы па рускай літаратуры для школьнікаў: выдзелены гадзіны для пазакласнага чытання. Пра гэта паведаміла **навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Навукова-метадычнай установы Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Кацярына ЦЕМУШАВА:**

— Кнігі для дзяцей павінны быць маляўнічыя, добра ілюстраваныя. Таму для школьнікаў 5-8 класаў прапануюцца дыдактычныя і дыягнастычныя гульні, якія настаўнік можа выкарыстоўваць падчас урокаў. Цяпер хлопчыкам і дзяўчынкам, прачытаўшы твор, прапануецца прыдумаць да яго набор хэштэгаў, або зняць відэаролік, або напісаць ліст сябру.

Летась дзіцячыя бібліятэкі сталіцы абслужылі 123 тысячы чытачоў. **Дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска Таццяна ШВЕД** запэўніла, што сучасныя дзеці чытаюць шмат, асабліва калі ёсць вялікі кніжны фонд.

— Іншым часам не кожны можа набыць жаданую кнігу, бо кошт выданняў нятанны. А вось прыйсці ў бібліятэку і прачытаць яе там можна заўсёды. Штогод з боку дзяржавы нам выдзяляюцца вялікія грошы на камплектаванне фондаў. Летась паступіла шмат новых цікавых беларускіх твораў, якія хутка становяцца папулярнымі. Варта адзначыць, што наша галоўная мэта — каб чытач прыйшоў у бібліятэку. Таму часта праводзім цікавыя экскурсіі і скайп-сустрэчы нашых наведвальнікаў з наведвальнікамі бібліятэк Расіі, ажыццяўляем новыя праекты. Напрыклад, у сталічнай дзіцячай бібліятэцы № 10 праводзіцца «Гурток сямейнага чытання 0+. Вырошчваем чытача самі». Ён створаны для таго, каб прывабіць тых малых, якія яшчэ не ўмеюць чытаць.

**Намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Юлія ДАШКЕВІЧ** адзначыла, што летась установай было выдадзена каля 50.

— На Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая пачнецца сёння і прадоўжыцца да 9 лютага ў выставачным павільёне на праспекце Пераможцаў, 14, будуць шырока прадстаўлены нашы выданні. Мы разумеем, што трэба шырока прапагандаваць цікавасць да чытання ў маладога пакалення, таму праводзім розныя акцыі і сустрэчы для дзяцей з пісьменнікамі. На тыдзень выходзіць прыкладна 10—15 мерапрыемстваў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**



Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.


## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13 |
| **Предмет аукциона** | |
| Лот № | Наименование |
| 1 | **Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-100264) общей площадью 106,8 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Первомайский с/с, д. Кальчицы, ул. Новины, 5А. Земельный участок общей площадью 0,1048 га предоставлен на праве аренды по 27.02.2039 г. для обслуживания здания магазина |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 10 600,00 белорусских рублей** | |
| 2 | **Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-74836) общей площадью 98,04 кв. м по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Хорошево, 3. Составные части и принадлежности: сарая (2 шт.), уборная. Земельный участок общей площадью 0,0668 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 9 700,00 белорусских рублей** | |
| 3 | **Здание магазина № 26 (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-26618) общей площадью 55,0 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Волошево, магазин № 126. Составные части и принадлежности: склад, сарай (2 шт.). Земельный участок общей площадью 0,0422 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживание и эксплуатации строений и сооружений |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 5 100,00 белорусских рублей** | |

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты:** Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 01.11.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 10.03.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Срок подачи документов: 09.03.2020 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

**Продавец:** частное строительное унитарное предприятие «ГостСтрой» (УНП 590778694), 223034, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Советская, д. 118, комн. 1/4, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридический момент», тел. +375 (29) 616-50-57.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **20 февраля 2020 г. в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение, инв. № 124/С-21348, здание административно-хозяйственное – административное здание, площадь 450,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22 | 29 636,98 |
| 2 | Капитальное строение, инв. № 124/С-21346, здание пристройки к заводоуправлению, площадь 298,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22 | 19 615,22 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 19.02.2020 г. до 17.00:** 1. Зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.** 2. Перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовало в газете «Звязда» от 19.12.2019 г.



## ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует

О снятии с аукциона по продаже имущества ОАО «Минский завод отопительного оборудования», назначенного на 12.02.2020 в 12.00, г. Минск, ул. Тимирязева, 29, лотов №№ 188–190, 362 (оборудование, бывшее в употреблении), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29

**Тел.: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

УНП 191021390



## Извещение о проведении 26 февраля 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Капитальное строение с инв. номером 420/С-39301 (наименование – магазин № 14/30), общей площадью 1153,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Железнодорожная, 12; капитальное строение с инв. номером 420/С-42217 (наименование – здание склада), общей площадью 135,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Железнодорожная, 12/1 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,2426 га, кадастровый номер 441300000011000455, назначение – земельный участок для обслуживания многофункционального здания (для размещения объектов розничной торговли) |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС** | 325 860,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 32 500,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1,5 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 февраля 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 06.02.2020 по 24.02.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).



**ООО «Расантехторг»** (организатор аукциона) проводит **09.03.2020 г.** торги в электронной форме в процедуре исполнительного производства № 60116003659, по продаже имущества ООО «ЛАйК-экспедиция» (продавец).

1. Сведения о предмете электронных торгов: автомобиль грузовой Ивеко ML 120E, гос. номер АН 8425-5, год выпуска – 2000.
2. Дата проведения электронных торгов: **09.03.2020 года.**
3. Место нахождения предметов электронных торгов: **Минский р-н, пос. Сеница, ул. Коммунальная, д. 1б, ДРСУ-735.**
4. **Начальная цена предмета электронных торгов без НДС: 8400 руб. 00 коп.**
5. Шаг аукциона: 5 % – 420 руб. 00 коп.
6. Сумма задатка: 10 % – 840 руб. 00 коп.
7. Срок экспозиции: 30 календарных дней.
8. Сумма затрат Поверенного по организации и проведению электронных торгов: 60 руб. 00 коп.
9. Расчетный счет для перечисления суммы задатка: УПИ ГУЮ Минского облисполкома, р/с BY84AKBB36420000002880000000 в ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК», код AKBBBY2X, г. Минск, УНП 600013502.

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – Электронные торги) будут проведены **09.03.2020 г. в 9.00** на электронной торговой площадке **WWW.TORGI24.BY,** окончание – **09.03.2020 г. в 17.00.** Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел. (8-029) 6703084, на сайте **WWW.TORGI24.BY.** Дополнительную информацию по лотам: **продавец** – ООО «ЛАйК-экспедиция», в лице судебного исполнителя Польгун М. П. – (8-029) 7764054. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг» – **WWW.TORGI24.BY.** Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по каждому лоту принимаются по **06.03.2020 г.**

Асабістае

# ДРЭВЫ ПОМНЯЦЬ... А МЫ?

**Некалі я працаваў настаўнікам у 3-й мінскай школе: больш за трыццаць гадоў дзень у дзень, можна сказаць, хадзіў аднымі і тымі ж сцежкамі, да драбніц ведаў іх. І пры гэтым, трапіўшы зноў, ледзьве пазнаў: выраслі новыя гмахі, а любімы сквер стаў зусім невялічкі. Горш за тое, дрэвам, што засталіся, кажуць, таксама пагражае высечка. Для таго каб спыніць яе, адстаяць сквер, мясцовыя жыхары збіраюцца ў суд, пішуць лісты. Я таксама пішу...**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сквер, які раскінуўся на раздарожжы вуліц Дзекабрыстаў і Парашутнай, прыгожы ў любую пару года. Летам ён звініць ад дзіцячых галасоў, маладыя маці гуляюць тут са сваімі дзеткамі. А калі расцвітаюць ліпы, дык здаецца, што з гаючым мядовым водарам, якім напоена ўсё наваколле, можна піць гарбату...

І цяпер ужо мала хто ведае, што перад вайной сотні дрэў тут пасадзілі вучні трэцяй сталічнай школы. Вось гэтую бярозку, магчыма, Леў Гелер, у 1942-м забіты ў Мінскім гета, а прыгажуні-таполі — Ігар Емяльянчык і Станіслаў Шварц. Першы загінуў у партызанскім атрадзе, другі — у Берліне 12 мая 1945 года... Елачка, магчыма, помніць рукі Ботвіча. У 1943-м ён скончыў Тамбоўскае лётнае вучылішча, і амаль тады ж яго самалёт быў збіты ў жорсткім баі за трыццаць кіламетраў ад горада Славянска...

А вось, побач са сцежкай, яшчэ адно адметнае дрэва. Яму, як выглядае, нейкім асколкам знесла вершаліну, з якой потым белымі свечкамі ўзняліся аж тры ствалы... Гэтае дрэва пасадзіў, магчыма, Герой Савецкага Саюза Казімір Шабан. У яго 23 чэрвеня 1943 года на Курскай дузе быў першы бой, а 3 жніўня таго ж 43-га самалёт падбілі... Лётчык пры гэтым змог пасадзіць яго на тэрыторыі, занятай ворагам, і потым прабіцца да сваіх.

Белград, Ахтырка, Сумы, Кіеў, Жытомір — гэта этапы яго баявога шляху. Як і Дзень Перамогі ў чэшскім Брно... А загінуў герой падчас вучэбнага палёту 9 ліпеня 1945 года, спрабуючы выратаваць баявы самалёт. Яго імя цяпер носіць трэцяя школа.

...Названыя тут выпускнікі (і, вядома ж, не названыя) не паспелі пабудаваць дамы, нарадзіць дзяцей. Яны паспелі пасадзіць дрэвы, якія цяпер, пазіраючы на нас, быццам пытаюцца: ці помнім мы тых, хто загінуў?

**Аляксандр Вашчанка,**
*г. Мінск.*

Мая вайна

# «Пакуль мама прыбегла з поля, у нас згарэла ўсё...»

**...Неяк прачытаў у «Звяздзе» артыкул «Мільёны непачутых гісторый» і вырашыў падзяліцца сваёй, бо з усіх тых хлапцоў, з якімі рос, застаўся я адзін. Яны рана пайшлі на той свет, што не дзіва: на долю нашага пакалення выпала столькі...**

Успамінаць гэта страшна, але ж моладзь павінна ведаць, праз што мы прайшлі.

Памятаю сам пачатак вайны. Мне было сем гадоў. Малы, цікаўны, я назіраў за калонамі невядомых машын... І раптам адна з іх скіравала проста на мяне... Я сігануў за бярозу, а немцы зарагаталі.

Праз два-тры месяцы я ўбачыў, як яны вялі групу палонных салдат. Тыя, галодныя, на хаду рвалі буракі і тут жа, сырымі, грызлі іх. Мне шкада было людзей, я кінуўся ў хату, узяў хлеба, каб некаму перадаць. Але маці стрымала мяне — пабаялася, што за гэты ўчынак немцы могуць забіць.

Фашысты ды іх памагатыя і сапраўды гаспадарылі на торфаарцелі, на станцыі Міхановічы, ахоўвалі аэрадром Мачулішчы. А ў лясах ужо з'явіліся партызаны. Яны сталі наведвацца ў наш Кайкаўскі пасёлак, бліжэйшы да лесу 13 хат, дзе бралі хлеб, што пяклі для іх мая бабуля і цётка (іх абедзвюх потым расстралялі).

З такімі вось бездапаможнымі людзьмі немцы былі смелыя, а партызан баяліся і, калі з імі пачыналася перастрэлка, у лес не ішлі, — з кулямётаў страчылі па вокнах хат. Нам, малым, мама загадвала тады падаць на падлогу.

А неяк раніцай ворагі ўварваліся да нас у хату і перавярнулі ўсё. Яны шукалі зброю нават у бочцы з агуркамі. Потым людзей пачалі зганяць на ток, але жанчыны не разгубіліся, узнялі сапраўдны лямант, сталі «скардзіцца», што з лесу наведваюцца партызаны — ім жыцця не даюць... Тым разам немцы нікога не забілі.

Калі ж сіламі мсціўцаў была падарвана вадакачка, знішчаны эшалон з боепрыпасамі, адбыліся выбухі на чыгунцы, літасці ад фашыстаў ужо не стала. Яны знішчалі сем'і, з якіх нехта быў у партызанах. Яўгенію Суржыц (у яе ваявалі два сыны) жывую ўкінулі ў студню, расстралялі дзвюх малых сястрычак.

А дату 28 жніўня мы запомнілі на ўсё жыццё. Маці ў той дзень пайшла на жніво, мы, пяцёра дзяцей, засталіся дома. Старэйшая сястра (ёй было адзінаццаць) карміла малодшых на кухні. І тут — моцны гул самалёта, страшэнны выбух і... вялізная дзірка ў сцяне.

Я выскачыў на ганак і ўбачыў, што на мяне ляціць самалёт, страляе — наша хата пачынае дыміцца, гарэць...

Пакуль маці прыбегла з поля, у нас нічога не засталося, і я пасля моцна шкадаваў, што мяне аглушыла выбухам. Калі б не, я таксама змог бы некага вынесці (брацікаў ратавала сястра), ці выратаваць хоць нешта з дабра...

Аднак галоўнае, што выжылі самі. Мама потым сказала, каб мы гэты дзень ніколі не забывалі, бо калі б тая бомба ўпала на некалькі сантыметраў бліжэй, ад нас нічога не засталося б, а так... Мы нават жартавалі, што нямецкаму лётчыку, які крыху прамахнуўся, трэба свечку паставіць.

Яшчэ я бачыў, як немцы расстралялі з аўтаматаў чатырох партызан. Пасля вайны разам з дырэктарам школы мы перапахавалі іх у брацкую магілу побач з 69 іншымі змагарамі.

А наогул за гады вайны ў Кайкаўскім сельсавеце (гэта тэрыторыя трох вёсак) загінула 288 чалавек.

...Помню, вядома ж, і наступленне нашай арміі. Тады салдаты далі мне два брыкецікі гароху, каб маці зварыла супу. Я, шчаслівы, схаваў іх за пазуху, каб ніхто не ўбачыў і не адабраў, але быў такі галодны, што не вытрымаў і адзін брыкецік па дарозе з'еў.

Цяпер не верыцца: на ежу кідаўся, не раўнуючы як галодны сабака. Здаралася, нехта дасць крыху мукі, мама зварыць зацірку. Якое ж гэта свята! Ды што там — галодныя, разутыя і раздзетыя — мы рады былі кожнай бульбіне, пры гэтым, калі прасіў дапамогі нехта з бежанцаў ці пагарэльцаў, маці старалася не адмовіць — дзялілася апошнім...

Першы час пасля пажару (усе нашы пабудовы згарэлі) мы жылі ў калгасным гусятніку, ад холаду хаваліся ў салому. Потым сям'я Пукальчыкаў уступіла нам маленькі пакойчык. У ім быў ложак, і мы, усе пяцёра дзяцей, клаліся на яго ўпоперак і спалі, хоць які там сон, калі ногі звісаюць долу?

Трохі пазней нам дазволілі заняць аварыйную хату. Страха ў ёй была дзіравая, і, калі ішоў дождж, у нас не хапала посуду, каб збіраць ваду... Нарэшце мы ўзялі крэдыт на будаўніцтва хаты на 10 гадоў. Але чым яго аддаваць, калі ў калгасе за працу амаль нічога не плацілі? Помню, мы ўчацвярох (тата-інвалід, мама і я з сястрой) за год атрымалі 40 кілаграмаў жыта. Калі падзяліць іх на ўсю сям'ю, атрымаецца на дзень на чалавека 16 грамаў. Усю бульбу, што вырошчвалі, і тытунь-самасад даводзілася прадаваць. Летам, і таксама на продаж, мы збіралі ягады і грыбы. Іх насілі на кірмаш. Самі жылі на галодным пайку: хлеба мама давала па тонénькай лустачцы...

І ў школу я пайшоў сапраўдным пудзілам — ва ўсім чужым, выпадковым. Нехта аддаў цыганскія жаночыя боцікі... Ды яшчэ і на абцасах. Я насіў, хоць дзяўчынкі з мяне і смяяліся. А пасля мне зрабілі «абноўку»: да старых выкінутых ботаў прыладзілі падэшву з дрэва. Хадзіць у такім абутку было цяжка, затое на сажалцы я адрываўся — абганяў нават тых, хто быў на каньках.

Вось такое ў мяне было маленства, такое жыццё. Яго трэба помніць.

**Антон Ліпніцкі,**
*г. Мінск.*

Вяртаючыся да надрукаванага

# «На тыя ж звароты сталі прыходзіць зусім іншыя адказы...»

**«Развaжанні вакол аднаго магілёўскага дворыка. Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца, ад каго залежыць утульнасць нашых прыдамавых тэрыторый і чаму жыхары незадаволены дзеяннямі камунальнікаў».**

Падставай для артыкула, змешчанага пад такім загалоўкам («Звязда», 28.12.19), паслужыў зварот у магілёўскі карпункт спадара Юрыя Сязёміна, які роўна год (як прызнаваўся) знаходзіцца ў стане перманентнай вайны з родным ЖЭУ № 12 за дрэвы, што пасля абрэзкі ператвараюцца ў слупы, за перанесеную ў нязручнае месца кантэйнерную пляцоўку для смецця, за сцежкі, за месца для выгулу сабак...

Карэспандэнт газеты на месцы, што называецца, ацаніла і перамогі, і паразы на гэтай «вайне», вынікам чаго стаў названы артыкул.

Пасля яго публікацыі ў рэдакцыю паступіў яшчэ адзін зварот спадара Юрыя Сязёміна.

«Не магу не падзякаваць газеце, і асабліва карэспандэнту Нэллі Зігулі, — піша ён, — за надрукаваны крытычны матэрыял. Галоснасць за кароткі час дапамагла камунальным арганізацыям пераасэнсаваць сваё стаўленне да ўзнятых праблем. На тыя ж звароты, што вельмі радуе, сталі прыходзіць зусім іншыя адказы: прызнаюцца памылкі, прымаюцца меры, прыносяцца прабачэнні і падзякі за маю актыўную пазіцыю. Атрымліваецца, што ўсё не так безнадзейна, як думалася раней, калі чытаў бюракратычныя адпіскі...»

У гэтым клубку камунальных праблем, дадае спадар Сязёмін, да канца яшчэ вырашаны не ўсе, але, на яго думку, яму ўдасца гэта зрабіць (аднавіць каля дома тую ж кантэйнерную пляцоўку) з дапамогай дэпутацкага корпуса, зваротаў у Міністэрства ЖКГ.

«...Я не з баязлівага дзясятка, — прызнаецца заяўнік, — не магу мірыцца з самавольствам, адкуль бы яно ні зыходзіла. А справядлівасць і свае правы ў любыя часы і пры любой уладзе даводзіцца адстойваць — на спадачку яшчэ ніхто нічога не прынёс і не прынясе».

Перажытае — не забытае

# ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ?

**Не верыцца, але ж былі часы, калі ў нас ці не ўсё куплялася па талонах, купонах і вялікім блаце, калі народ запасаўся, хто як мог.**

Дык вось зайшоў я неяк дамоў да свайго калегі. Бачу — у яго ў калідоры нейкі мяшок стаіць.

— Пашчасціла: мех цукру набыў, — адпіхнуўшы нагойката, пацешыўся гаспадар. — Цяпер надоўга хопіць...

А потым яшчэ і дадаў, што яго сусед купіў быў грэчкі — таксама з мяшок. Праз нейкі час хацеў кашы зварыць, а ў крупах — нейкая трасца завялася... Прыйшлося сваякам-вяскоўцам прадаць: хоць куры з'елі.

— А цукар жа пастаіць? — спытаў у мяне калега. — З ім жа нічога не зробіцца?

— Ну вядома ж, — запэўніў я ды...

Недзе праз месяц яшчэ раз завітаў у кватэру і мяшка ў калідоры ўжо не ўбачыў.

— Дзе дзеўся? — спытаў у калегі.

Той хіба ўздыхнуў:

— Помніш майго ката? Ён нездарма тут круціўся. Мы на гарачым яго злавілі: ён, шэльма, мех памячаў, прычым пастаянна... Жонка сказала, што цукар трэба выкінуць (хоць варта было б ката!). А я — не паверыш — не змог: завёз на лецішча. Можа, хоць на віно скарыстаю?

...Спіртное ў тыя «шчаслівыя» часы я купляў на ўсе талоны, хоць сам і не піў... Дамашняе віно з той пары не п'ю і пагатоў!

**Яўген Шастакоў,** *г. Гомель.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# З глыбіні стагоддзяў і зямлі


Вольга ЛЯЎКО.


Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.


Вадзім ЛАКІЗА.


Дзяніс ДУК.


Аляксандр БАШКОЎ.


Наталля ХВІР.

**У надзвычай цікавай дыскусіі бралі ўдзел кандыдат гістарычных навук дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім ЛАКІЗА, доктар гістарычных навук загадчык Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Вольга ЛЯЎКО, доктар гістарычных навук рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Дзяніс ДУК, кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Аляксандр БАШКОЎ, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля ХВІР.**

## АРХЕОЛАГІ ДАПАЎНЯЮЦЬ ЛЕТАПІСЦАЎ

**«Звязда»:** ***У гістарычнай навуцы археалогія займае асаблівае месца — гэта доказная база існавання той ці іншай цывілізацыі, народнасці, этнасу на пэўнай тэрыторыі ў пэўны час, нават калі гэта не пацверджана пісьмовымі крыніцамі. Любы народ, пачынаючы шукаць і ўдакладняць свае карані, звяртаецца ў тым ліку і да археалагічных знаходак. Беларусы тут не выключэнне, асабліва зараз, калі самаідэнтыфікацыя народа з'яўляецца фактычна сінонімам суверэнітэту і незалежнасці краіны. У нашых археолагаў на сённяшні дзень ёсць належныя ўмовы для працы і яе заўважны плён?***

**Вячаслаў Даніловіч:** Археалагічнай навуцы сёння ўдзяляецца вельмі значная ўвага на самым высокім дзяржаўным узроўні, у тым ліку дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта. Кіраўніцтва Акадэміі навук нас у гэтым плане заўжды падтрымлівае. У выніку створана сістэма археалагічных даследаванняў, якая дазваляе рухацца ўперад, праводзіць раскопкі і адначасова на належным узроўні захоўваць археалагічную спадчыну. Археалагічныя даследаванні каардынуе Інстытут гісторыі, але мы вельмі плённа супрацоўнічаем з нашымі ВНУ, у тым ліку з рэгіянальнымі — Полацкім, Магілёўскім, Брэсцкім, Віцебскім, Гродзенскім, Гомельскім універсітэтамі, не кажучы ўжо пра гістарычны факультэт БДУ. На сённяшні дзень у нас ёсць тры пастаянна дзеючыя гісторыка-археалагічныя экспедыцыі — Полацкая, Брэсцкая і Гродзенская. У плане захавання археалагічных аб'ектаў мы шчыльна супрацоўнічаем з Міністэрствам культуры. У рэгіёнах цяпер праводзіцца інвентарызацыя помнікаў археалогіі... Што датычыцца плёну працы — у найбліжэйшы час запланаваныя даволі значныя археалагічныя даследаванні ў нашай «калысцы беларускай дзяржаўнасці» — Полацку, на замчышчы. Вельмі разлічваем, што новыя даследаванні і знойдзеныя артэфакты дапамогуць атрымаць яшчэ больш унікальных звестак аб пачатковай гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

**Вольга Ляўко:** Калі гаварыць пра першаснасць археалагічных знаходак — возьмем, напрыклад, перыяд, які ўжо мае пісьмовыя крыніцы, IX—XIII стагоддзі. Але яны на той момант адлюстроўвалі толькі адзінкавыя факты. І каб скласці факты з асобных пісьмовых крыніц у пэўную сістэму і паказаць развіццё грамадства на пэўным прамежку часу, патрэбна менавіта археалогія. Мы ўжо маем дастаткова маштабныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі, дзякуючы чаму змаглі ўключыць вялікі пласт археалагічных матэрыялаў у доказ вытокаў нашай дзяржаўнасці. Калі мы гаворым пра надзвычай сур'ёзную тэму — дзяржаўнасць, у першую чаргу абапіраемся на знакавыя аб'екты, нашы старажытныя гарады. Так Полацк — самы старажытны па пісьмовых крыніцах і адзін з найстаражытнейшых па археалагічных. Комплекс матэрыялаў пацвярджае, што менавіта тут маглі зарадзіцца найбольш важныя палітычныя, эканамічныя працэсы. Гэта ўсё адлюстравана і ў матэрыяльнай культуры, пацвярджаецца ёй. Праводзячы раскопкі, мы шукаем і знаходзім адказы на розныя пытанні. Як узаемадзейнічала мясцовае насельніцтва з прышлымі, як, у якім кірунку развіваліся прылеглыя тэрыторыі? Усё дакладна і ясна відаць па археалагічных матэрыялах... Археалогія — гэта звяно, якое звязвае розныя гістарычныя факты, розныя меркаванні вучоных і здымае шэраг спрэчак. Таму што калі ў якасці доказу прыкладзены матэрыяльны факт, ужо нікуды не падзецца... Напрыклад, я знайшла помнік эпохі вікінгаў на Дзвіне — Кардон, які сведчыць, што найстаражытнейшы адрэзак шляху «з варагаў у грэкі» праз лясную зону Усходняй Еўропы праходзіў якраз праз тэрыторыю Беларусі, а не праз Гнёздава пад Смаленскам, як было напісана ў падручніках. Гнёздава, аказваецца, стала найбольш актыўна выкарыстоўвацца на гэтым шляху аж на два стагоддзі пазней, чым наш адрэзак... Важныя моманты гісторыі прасочваюцца непасрэдна на археалагічных матэрыялах. Калі мы складваем зернейка да зернейка, у нас атрымліваецца добры колас, і мы ўжо маем пераканаўчую пазіцыю, якая пасля выліваецца ў канцэпцыю. Інстытут гісторыі распрацаваў канцэпцыю дзяржаўнасці, яе вытокаў, развіцця, абапіраючыся ў тым ліку на вялікую колькасць нашых археалагічных помнікаў.

## ВАКОЛ «КАЛЫСКІ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

**«Звязда»:** ***І пачатак гэтай дзяржаўнасці, як ужо даказана, — у Полацку. Але тое, што гэта найстаражытнейшы з вядомых нашых гарадоў, стала вядома не ўчора. І раскопкі ў горадзе — на даволі абмежаванай тэрыторыі — вяліся не адно дзесяцігоддзе. Ці можна там спадзявацца на нейкія новыя значныя знаходкі?***

**Вячаслаў Даніловіч:** Археалагічныя даследаванні — вельмі карпатлівая праца. Раскопкі, якія пачаліся яшчэ з 50-60-х гадоў мінулага стагоддзя, праводзіліся на адносна невялікіх участках. У Полацку прысутнічае велізарны культурны пласт — каб усё гэта дасканала вывучыць у навуковым плане, патрэбны час.

**Дзяніс Дук:** Дзякуючы ўказу Прэзідэнта ў Полацку створана пастаянна дзеючая археалагічная экспедыцыя. У рамках даручэння тагачаснага намесніка прэм'ер-міністра дзяржавы, а пасля кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай была створана яшчэ адна экспедыцыя па вывучэнні полацкай школы дойлідства, менавіта Спаса-Праабражэнскай царквы. Гэты ўнікальны помнік ніколі не вывучаўся з пункту гледжання археалогіі, толькі ў 2015 годзе пачаліся раскопкі. Дзякуючы сумесным намаганням і падтрымцы на дзяржаўным узроўні мы вызначылі самыя галоўныя пытанні, на якія атрымалі адказ. Даследаванні пацвярджаюць, што сапраўды Полацк у IX стагоддзі існаваў. Напрыклад, Смаленск таксама згадваецца ў летапісе ў IX стагоддзі, але археолагі дагэтуль не знайшлі культурнага слоя гэтага часу, і гэта праблемны момант. Самае галоўнае, што па выніках раскопак мы паказалі, што Полацк з'яўляецца старажытным менавіта славянскім горадам. Але пакуль нельга сказаць, што мы цалкам маем уяўленне пра сацыяльную структуру гэтага часу, таму што гарадзішча, адкуль атрыманы гэтыя вынікі, вывучана яшчэ не цалкам. Напрыклад, у класічных падручніках і кнігах па Полацку, выдадзеных яшчэ гадоў дваццаць таму, гаворыцца, што Верхні замак фактычна лічыўся тым самым пачатковым Полацкам, дзе была рэзідэнцыя полацкіх князёў. Але на сённяшні дзень мы не маем археалагічных доказаў, што Верхні замак у прынцыпе ў IX—XII і нават у XIII стагоддзі быў умацаваны, як гэта павінна было быць, калі б ён быў дзяцінцам. Першае ўмацаванне Верхняга замка па дэндрахраналогіі (а гэта вельмі дакладны аналіз) паказвае толькі XIV стагоддзе... Цяпер у раёне Верхняга замка праводзіцца маштабная рэканструкцыя, і ў археолагаў з'явілася ўнікальная магчымасць для вывучэння праблемных момантаў гісторыі Полацка...

**«Звязда»:** ***Дарэчы, работы на Верхнім замку сёння пад пільнай увагай грамадскасці. Некаторыя лічаць, што помнік гісторыі дзяржаўнага значэння пад пагрозай як мінімум сапсавання...***

**Вадзім Лакіза:** Так, цяпер гэтая сітуацыя актыўна абмяркоўваецца ў сацыяльных сетках. Выказваюцца вельмі розныя меркаванні. Але пакуль што заказчык тых работ не адышоў ні на адну кропку ад выканання заканадаўства пры ўзгадненні і, спадзяюся, далейшым ажыццяўленні мер па ахове археалагічнай спадчыны.

**Дзяніс Дук:** Большая частка Верхняга замка была фактычна без нагляду шмат гадоў, з таго моманту, як адтуль выехала гарадская бальніца, і нікога гэта асабліва не турбавала. Сёння ёсць інвестыцыйны праект, ёсць цалкам разуменне, што там будзе наведзены парадак.

**Вольга Ляўко:** Некаторыя калегі-гісторыкі пачалі заклікаць у інтэрнэце: маўляў, падымайся, народ, бараніць Полацк. Ад чаго? Тыя, хто сапраўды хвалюецца, што адбываецца на Верхнім замку і ў якім стане будуць аб'екты, маглі бы звярнуцца да нас, і мы б усё паказалі. У 2018 годзе, калі распрацоўваўся праект рэканструкцыі гэтай тэрыторыі, прадстаўнікі праектнай установы да мяне ездзілі нават па два разы на тыдзень з кожнай часткай плана на ўзгадненне. Для іх я зрабіла вялікую папку з матэрыялямі па тых даследаваннях, якія ўжо праводзіліся на тэрыторыі Верхняга замка. На карце пазначаны ўсе раскопы, якія за 80 гадоў даследаванняў Полацка былі зроблены. Інстытут даў свае рэкамендацыі, як зрабіць рэканструкцыю, каб мінімізаваць умяшанне ў культурны пласт, каб зберагчы яго для будучых пакаленняў, бо наскокам схапіць усё і бегчы за бульдозерам, выцягваючы з-пад яго нейкія знаходкі, было б няправільна. Мы папрасілі падумаць над тым, як зрабіць праект, каб як мага меншым было ўмяшанне ў пласт, нават катэгарычна забаранілі выкарчоўваць дрэвы, толькі спілоўваць. Усё гэта цяпер прадугледжана і ўжо здзяйсняецца. На адкрытых участках, на якіх можна правесці стацыянарныя раскопкі, пастаянна прысутнічаюць археолагі. Кожны кавалак зямлі на гэтай тэрыторыі знаходзіцца пад нашым кантролем. Больш за тое, арганізацыя, якая адказвае за работу ўсіх будаўнічых брыгад на гэтай пляцоўцы, кантралюе поўнае выкананне ўсіх нашых патрабаванняў. На парушэнні, якія могуць дапускацца, рэакцыя імгненная і жорсткая — аж да адхілення арганізацыі ад далейшага ўдзелу ў работах...

**Дзяніс Дук:** На Верхнім замку ў пасляваенны час не было ніякага праекта па археалагічных раскопках. Напрыклад, старажытны княжацкі храм XII стагоддзя быў выпадкова адкрыты, калі капалі катлаван для будаўніцтва морга. І сёння, калі апошні знесены, пляцоўка будзе выкладзена спецыяльнай пліткай, палачане змогуць пагледзець контуры гэтага храма, уявіць, як ён размяшчаўся. Парэшткі храма, які, хутчэй за ўсё, называўся ў гонар Архангела Міхаіла, захоўваюцца ў зямлі — калі з'явіцца такая патрэба, можна будзе іх далей даследаваць. Драўляныя будынкі XIII стагоддзя, якія знаходзяцца якраз на тым месцы, дзе самы вялікі культурны пласт у Полацку — да васьмі метраў, — як былі адкрыты? У 1958 годзе, калі ўзводзіўся будынак анкадыспансера, каўшом экскаватара былі выкінуты на паверхню бярвенні. Тады грамадскасць Полацка, простыя людзі ўзнялі пытанне, што тут робіць экскаватар, калі відавочна, што бярвенні старажытныя. І ў той час работы былі прыпыненыя, на месцах будаўніцтва з'явіліся прафесійныя археолагі і пачаліся буйнамаштабныя раскопкі Верхняга замка. Сёння атрыманыя ў 1960-я гады даныя з'яўляюцца залатым фондам археалагічнай навукі...

**Наталля Хвір:** Заканадаўствам, у прыватнасці палажэннямі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, прадугледжана распрацоўка праектаў зон аховы, згодна з якімі рэгламентуюцца пытанні ўтрымання і выкарыстання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. На жаль, пакуль такі праект зоны аховы гістарычнага цэнтра Полацка не гатовы. Мясцовыя органы ўлады павінны арганізоўваць распрацоўку праектаў зон аховы і не толькі гістарычных цэнтраў гарадоў, а ў тым ліку і аб'ектаў археалогіі, архітэктуры, помнікаў гісторыі. На працягу 2019 года была арганізавана распрацоўка і зацверджана Міністэрствам культуры 28 праектаў зон аховы менавіта па археалогіі. Такія дакументы павінны абавязкова быць, з імі было б прасцей працаваць, нават, калі ёсць нейкія парушэнні, прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці.

**Вячаслаў Даніловіч:** Так, трэба аформіць зону аховы гістарычнага цэнтра Полацка. Фактычна яна ёсць — магчыма, на нейкім этапе мясцовыя ўлады не зрабілі крок, каб яе афіцыйна зарэгістраваць. Але самае важнае, што даследаванні тут выконваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам. Думаю, шчыльнае ўзаемадзеянне дапаможа вырашаць многія праблемныя моманты. Наш інстытут супрацоўнічае і з Міністэрствам адукацыі, і з Міністэрствам культуры. Калі ўзнікаюць пэўныя пытанні, мы тэрмінова прымаем рашэнні, прыпыняем работы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## БУЛЬДОЗЕР НА МАГІЛЬНІКУ

**«Звязда»:** *У гэтым кантэксце можна згадаць яшчэ адзін нядаўні выпадак, які атрымаў вялікі рэзананс у сецыве, — закрыццё помніка жалезнага веку ў Любанскім раёне, дзе будуюць калійны камбінат...*

**Вадзім Лакіза:** Рэзананс, дарэчы, не вельмі зразумелы. Таму што Інстытутам гісторыі праведзена вялікая работа сумесна з заказчыкам, які фінансаваў у адпаведнасці з заканадаўствам пачынаючы з 2012 года цалкам усе даследаванні. Упершыню, я думаю, нават у сусветнай гісторыі гарадзішча жалезнага веку вывучана цалкам, там не засталося ніводнага квадратнага метра, які не даследаваны. Практычна сем гадоў праводзіліся мэтавыя комплексныя навуковыя даследаванні, атрыманы тысячы археалагічных артэфактаў, зроблены розныя аналізы, радыевугляроднае датаванне дзясяткаў арганічных узораў. Ужо сёлета на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры пасля таго, як былі вывучаны ўсе падрыхтаваныя намі дакументы, праслуханы даклады — мой і Сяргея Лінеўіча, які з красавіка да лістапада 2019 года кіраваў палявымі даследаваннямі на помніку, было прынята рашэнне ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры па выключэнні гарадзішча Обчын са спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў у сувязі з яго поўным вывучэннем... І калі на некаторых парталах з'явілася інфармацыя, што гарадзішча жалезнага веку знеслі дзеля калійных распрацовак, мы абавязалі іх змяніць загаловак на той, што адпавядае рэчаіснасці. Гарадзішча — гэта не архітэктурны аб'ект, яго не знося, яно цалкам даследавана і пазбаўляецца свайго статусу.

Натуральна, нам, археолагам, гісторыкам, шкада, што на тэрыторыі, дзе знойдзены карысныя выкапні, нельга было пакінуць гарадзішча, але ўся навуковая інфармацыя пераносіцца ў справаздачы, пісьмовыя крыніцы, артыкулы і будучыя манаграфіі, а знаходкі перадаюцца ў музеі. Краіне патрэбныя карысныя выкапні, гэта наша эканоміка. Да таго ж інвестар, які ўклаў грошы ў распрацоўку радовішча, не пашкадаваў іх і на дэталёвае вывучэнне помніка археалогіі.

Зусім па-іншаму склалася сітуацыя падчас рэканструкцыі Гальшанскага замка, калі заказчык і арганізацыя, якая адказвае за правядзенне аўтарскага нагляду, не выканалі дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, Кодэкса аб культуры. Як вынік — часткова разбураны і пашкоджаны бульдозерам пахаванні XIII—XIV стагоддзяў. Мы за ўласна інстытуцкія грошы адправілі людзей для правядзення выратавальных даследаванняў, хоць гэта была задача заказчыка...

Да пачатку правядзення земляных работ па добраўпарадкаванні ў Гальшанах заказчыку належала звярнуцца ў Інстытут гісторыі і правесці археалагічную экспертызу зоны навабудоўлі, а пры неабходнасці і патрэбныя археалагічныя даследаванні.

**«Звязда»:** *Ці не ёсць тое, пра што зараз мы гаварылі, сведчаннем, што нарматыўна-заканадаўчая база на сёння недастатковая, каб аб'екты, якія ўяўляюць цікавасць для археалогіі, былі абароненыя ад маштабных будаўнічых работ, напрыклад?*

**Вадзім Лакіза:** Ёсць пэўныя нарматыўна-прававыя акты, якія абавязваюць заказчыка ажыццяўляць і выконваць меры па ахове археалагічнай і гісторыка-культурнай спадчыны. Калі адбываюцца буйныя будаўнічыя ці іншыя работы, археолагі павінны ажыццявіць археалагічную экспертызу і выратавальныя археалагічныя даследаванні. У нашым выпадку ў Полацку будуць праводзіцца менавіта такія выратавальныя ахоўныя археалагічныя даследаванні. І так паўсюль — у Мінску, Гродне, Віцебску, на гарадзішчы Обчын, тэрыторыі будаўніцтва чыгунак, аўтадарог, мастоў, нафтавых свідравін. Таму вялікая колькасць навуковых работ сёння завязана на земляных работах ці даследаваннях у зонах будоўляў. Напрыклад, за 2019 год Нацыянальная акадэмія навук Беларусі ажыццявіла 220 адміністрацыйных працэдур па выдачы дазволаў на права правядзення археалагічных даследаванняў, і большасць з іх (180) — у зонах навабудоўляў.

А ўвогуле арганізацыі павінны больш узаемадзейнічаць. Напрыклад, яшчэ на стадыі распрацоўкі горадабудаўнічых праектаў у праектных арганізацыях няма спецыялістаў, якія ведаюць, што такое культурны пласт, яны незнаёмы з гістарычнымі крыніцамі. Чаму б да гэтай справы ўжо на этапе праектавання не далучаць археолагаў?

**«Звязда»:** *Наколькі рэкамендацыі, якія даюць археолагі, павінны быць улічаны? Ці можа стацца так, што рэкамендацыі стануць толькі рэкамендацыямі, а забудоўшчык зробіць так, як ён хоча? Ці ёсць нормы, якія павінны выконвацца ў абавязковым парадку?*

**Вадзім Лакіза:** Тут трэба сказаць пра дзяржэкспертызу. Інстытут гісторыі ажыццяўляе некалькі адміністрацыйных працэдур у яе кантэксце. Напрыклад, выдае заключэнні аб наяўнасці ці адсутнасці археалагічных аб'ектаў на тэрыторыі будаўнічых, меліярацыйных і іншых відаў работ. Калі адказная асоба ў органах мясцовай улады дакладна ведае заканадаўства, парушэнняў па вялікім рахунку не павінна быць. Без такога заключэння яна не павінна выдзяляць участак пад будаўніцтва фізічнай, юрыдычнай асобе, індывідуальнаму прадпрымальніку. Калі пачынаюцца праектныя работы, яны ўзгадняюцца Міністэрствам культуры на наяўнасць гісторыка-культурных каштоўнасцяў і Нацыянальнай акадэміяй навук на аб'екты археалогіі. Праект не зможа прайсці дзяржэкспертызу, калі ў ім няма распрацаваных мер па ахове археалагічнай спадчыны.

Важна, каб нарматыўна-прававыя заканадаўчыя акты выконваліся ўсімі міністэрствамі і ведамствамі і мясцовымі органамі ўлады. Але хто гэта будзе кантраляваць? Нам не хапае інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны — аналагічнай па фунцыях з Дзяржінспекцыяй па ахове расліннага і жывёльнага свету.

**Наталля Хвір:** У Літве існуе такі орган — дэпартамент па ахове культурна-гістарычнай спадчыны, і там працуе 68 чалавек. Гэта на маленькую Літву!..

## МАРКЕТЫНГ ЦІ РЭКЛАМА ДЛЯ ЧОРНЫХ КАПАЛЬНІКАЎ?

**«Звязда»:** *Але калі працягваць аналогію з інспекцыяй па ахове расліннага і жывёльнага свету... Колькі браканьераў ні ганяюць, яны ўсё роўна ёсць. Тое ж самае, здаецца, датычыцца гістарычных помнікаў, бо пакуль у тых жа чыноўнікаў, ды і ў простых людзей не будзе ўсведамлення, што гэта трэба зберагаць і шанаваць, ніякія праверкі і штрафы не дапамогуць. Асабліва гэта праблема актуальная для археалогіі. Як данесці да людзей, што гэта каштоўнасць, калі яно не так відавочна, як з помнікамі архітэктуры ці з тымі самымі слуцкімі паясамі, якімі мы прывыклі ганарыцца і лічыць іх помнікамі? Што чарапкі і косці — таксама каштоўнасць...*

**Наталля Хвір:** Трэба пачынаць з дзіцячага садка, каб з самага ранняга ўзросту чалавек усведамляў, што ён частка гэтай краіны, і разумеў, што такое гісторыя.

**Вячаслаў Даніловіч:** Мяняць стаўленне грамадскасці мы можам агульнымі намаганнямі. Вучоныя Інстытута гісторыі не сядзяць выключна ў Мінску ці Полацку, не замыкаюцца толькі на даследаваннях. Праводзіцца шэраг канферэнцый на рэгіянальным узроўні, разам з Міністэрствам адукацыі праз мясцовыя аддзелы адукацыі ў цэлым шэрагу раёнаў арганізуем археалагічныя дзіцячыя школьныя летнікі, калі на канікулах дзеці ўдзельнічаюць у раскопках пад наглядам археолага. Большасць знаходак з рэгіёнаў мы пакідаем у мясцовых музеях. Адзінае — у інстытут перадаём нейкія ўнікальныя рэчы, якія патрабуюць адмысловых даследаванняў, кансервацыі. Да справы захавання гісторыка-культурнай спадчыны далучаюцца нашы калегі з Акадэміі навук. Так, нам трэба было прыдумаць, як захаваць човен, які пазалетась дасталі з Нёмана. Дзякуючы падтрымцы старшыні прэзідыума Акадэміі навук Уладзіміра Гусакова, вучоныя Інстытута хіміі новых матэрыялаў зрабілі адмысловы састаў, які пакрыў унікальную знаходку (калі навукоўцы з Інстытута эксперыментальнай батанікі правялі дэндрахраналагічны аналіз, высветлілася, што дуб, з якога зроблены човен, спілены прыблізна ў 1510 годзе). Цяпер яго можна ўбачыць у музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Акадэміі навук.

**«Звязда»:** *Можа, у тым і праблема, што мы ўсе археалагічныя знаходкі акумулюем або ў Інстытуце гісторыі, альбо у краязнаўчых музеях, якія цяпер не ва ўсіх раёнах ёсць? А можа варта было б, адкрываючы гістарычныя аб'екты для доступу турыстаў, рабіць на месцы невялікую археалагічную экспазіцыю, якая сведчыла б пра тое, што было знойдзена?*

**Аляксандр Башкоў:** На Брэстчыне праводзіліся археалагічныя даследаванні на аб'ектах, якія сталі турыстычнымі. На базе Ружанскага палаца-паркавага комплекса, які пакрысе аднаўляецца, зроблены музей, у які перададзены тысяча знаходак. Сёння ўсе сілы сканцэнтраваны на рэканструкцыі тэатральнага корпуса, тут узновяць тэатр і мяркуецца, што яшчэ размесціцца гатэль і пункт харчавання. У Косаўскім палацы



Касцяны амулет «Вуж», выраблены ў другой палове III тысячагоддзя да нашай эры, — са знаходак нашых археолагаў.

будуць выставачная зала, музейная экспазіцыя, атэль, офісы, кавярня. Сюды перадаецца каля сямісот знаходак. У Скоках канцэпцыя музея крыху іншая — акцэнт робіцца на культурна-асветніцкай дзейнасці, і тыя матэрыялы, якія мы там знайшлі, а іх каля двухсот, таксама плануем для перадачы. Сёння турыст, які прыязджае на аб'ект, знаёміцца з архітэктурай, экспазіцыяй, гісторыяй, культурай. Я сам сведка, што, нягледзячы на тое што работы на Косаўскім палацы яшчэ не завершаны, у любы час там можна ўбачыць турыстаў, і не толькі беларускіх. Цяпер цікавасць да нашай гісторыі ўзрасла, яе трэба падтрымліваць, развіваць. І сёння Інстытут гісторыі, ВНУ і музеі робяць усё для таго, каб папулярызаваць археалогію.

**«Звязда»:** *Магчыма, археалогіі не хапае маркетынгавых ходаў, можа, нават на мяжы нейкай легенды, напрыклад пра рэшткі хаты Скарыны, якую знайшоў Дзяніс Дук (пра гэта давялося пачуць ад палачан), ці пра шлем нібыта самога Ізяслава, які нядаўна дасталі з Бярэзіны (адна з самых папулярных леташняй восенню навін у сецыве)?*

**Дзяніс Дук:** Полацкая легенда мае свае карані. Наша экспедыцыя знайшла рэшткі кляштара бернардзінцаў, які быў на пачатку XVI стагоддзя і ў якім (можна меркаваць, калі ўлічыць яго знаходжанне), наш першадрукар атрымаў пачатковую адукацыю. І гэта — праўда. А вось наконт легенды пра хату Скарыны... Па-першае, гараджане ў той час жылі ў дамах (хата — сялянскае жыллё). Па-другое, я супраць такіх «маркетынгавых хадоў», калі толькі яны не абуджаюць здаровую цікаўнасць да вывучэння мінулага. Мы дамагаемся, каб людзі ведалі, хто мы, адкуль, а легенды, калі яны не падрываюць цікаўнасці да вывучэння сапраўднай гісторыі, няхай існуюць.

**Вольга Ляўко:** А што датычыцца шлема з Бярэзіны — сам шлем існуе, шум вакол таго, каму ён мог належаць. І шум — не вельмі добра: не трэба перабольшваць, гэта губіць каштоўнасць прадметаў. Спачатку сенсацыя выклікае бурную рэакцыю, а пасля — адваротная сітуацыя... І ўвогуле, публічныя паведамленні аб сапраўдных ці ўяўных археалагічных знаходках нярэдка служаць дрэнную службу — прыцягваюць увагу чорных капальнікаў...

**«Звязда»:** *З імі ніяк нельга наладзіць нейкае ўзаемадзеянне?*

**Вольга Ляўко:** Часам да нас у інстытут звяртаюцца людзі, якія прапануюць перадаць нейкія нібыта выпадкова знойдзеныя рэчы музеям, выдаючы сябе за патрыётаў. Глядзіш на іх знаходкі і разумееш, што чалавек выціснуў з культурнага пласта ўсё, што можна было, і большасць знаходак прадаў. Яго не хвалюе, што рэч павінна была ляжаць ў зямлі, што спецыялістам важна, як яна размяшчалася, што яна дазволіць вывучыць пласт, пацвердзіць, напрыклад, што тут з пэўнага часу былі славяне, карысталіся гэтымі рэчамі. Але калі людзьмі кіруе сквапнасць, заклікаць іх да грамадскай і грамадзянскай свядомасці бескарысна.

**Вадзім Лакіза:** І не трэба чорным капальнікам выдаваць сябе за аматараў гісторыі. Што ім перашкаджае далучыцца да прафесійных археолагаў, якія маюць адкрытыя лісты? Сотні валанцёраў сёння ўдзельнічаюць у такіх раскопках. Існуе адпаведная ідэалогія чорнага капальніцтва, і яна падмацавана сродкамі, бо ў свеце ёсць попыт на археалагічныя артэфакты. І нашу археалагічную спадчыну не толькі псуюць, абы-як выкопваючы, але і прадаюць знойдзенае, робячы на гэтым грошы.

**Наталля Хвір:** І пакуль на дзяржаўным узроўні гэта афіцыйна не забаронена рабіць. Напрыклад, на сённяшні дзень існуе некалькі інтэрнэт-рэсурсаў, на пляцоўцы якіх можна ў свабодным доступе набыць праз інтэрнэт пэўныя артэфакты. Тут ужо патрэбна далучэнне спецыялістаў і прадстаўнікоў Міністэрства ўнутраных спраў. Ёсць пэўныя артыкулы і ў Крымінальным кодэксе, якія прадугледжваюць прыцягненне да крымінальнай адказнасці. Але сапраўды ўжо ўсе (Акадэмія навук, Інстытут гісторыі, Міністэрства культуры, іншыя зацікаўленыя) стаміліся гаварыць на гэтую тэму. Неабходна пачаць дзейнічаць.

**Вадзім Лакіза:** Вельмі важны маральны аспект. Шкада, што нашымі апанентамі часам выступаюць людзі, якія павінны быць нашымі калегамі: гісторыкі, археолагі. Пра што можна гаварыць, калі ў сецыве выходзяць рэпартажы пра чорных капальнікаў і людзі, якія павінны клапаціцца пра захаванне спадчыны, такім матэрыялам ці спрыяюць, ці ставяць «лайкі»?

**Вольга Ляўко:** Я баюся цяпер ставіць на ўлік некаторыя помнікі археалогіі, таму што дам чорным капальнікам канкрэтную прывязку да аб'екта, да якога яны пойдуць і тут жа знішчаць.

**Вадзім Лакіза:** Пакуль мы маем такую сітуацыю, як ёсць з чорным капальніцтвам, многія археалагічныя базы павінны быць закрыты. На канец года ў Інстытуце гісторыі звыш 3400 аб'ектаў археалогіі было ўключана ў рэестр. Але засталіся пытанні аб іх уключэнні ў інфармацыйную сістэму. Што ж будзе, калі на карту наносіць дакладныя каардынаты? Сёння чорныя капальнікі добра праінфармаваны і забяспечаны сродкамі GPS.

**Наталля Хвір:** Мы лаяльна ставімся да адсутнасці ахоўных дошак на аб'ектах археалогіі, нягледзячы на тое што яны павінны быць у адпаведнасці з патрабаваннем кодэкса. Я на ўласныя вочы бачыла разрытыя раскопы ў Заслаўі, а побач ляжала ахоўная дошка. Там будавалася дарога, і, напэўна, тыя ж самыя дарожныя рабочыя ўбачылі шыльду і пачалі капаць.

**Вячаслаў Даніловіч:** Неабходна ведамаснае ўзаемадзеянне, павінен быць штраф для тых, хто парушае, і каб былі прэцэдэнты. Практыка паказвае, што нават за наяўнасць металадэтэктара без адпаведнага дазволу павінны быць штрафныя санкцыі. Тады сітуацыя будзе пераломлівацца і, можа, прыйдзе час, калі можна будзе спакойна гаварыць пра археалагічныя аб'екты і зрабіць рэестр публічным. І гэта будзе нагода не для пошуку лёгкай нажывы, але для гонару за сваю краіну і для цікавасці да яе гісторыі.

**Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
**Запісала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 10 марта 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-357*,** | Микрорайон «Заболоть-2» | 01046 | 440100000002010093 | 3498,97 | 17 938,90 | 3500 |

* - Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения;

** - победитель аукциона возмещает убытки, причиняемые землепользователю в связи с изъятием части земельного участка и удалением расположенных на нем зеленых насаждений в сумме 2200 рублей, а также со сносом недвижимого улучшения (колодец «а») в сумме 1200 рублей.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» и решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 10 марта 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования. Дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 10 февраля по 4 марта 2020 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальные сайты организатора торгов **www.grodno.gov.by, gcn.by**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

Предмет аукциона:
**Производственный корпус № 2** (производственный корпус № 2), общ. пл. **2836 кв. м**, инв. № **710/С-41887**, по адресу: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181.** Начальная цена с НДС 20 % – **284 664,96 бел. руб.**

**Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 741000000007002243, предоставлен на праве аренды по 06.10.2115 (доля 4304/20000) для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения, общая площадь 2,5909 га

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, удостоверением договора, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора купли-продажи, государственной регистрацией перехода права собственности на капитальное строение, а также доли в праве на земельный участок, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 23.10.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.02.2020** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.02.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко»** (место нахождения: 222201, Минская обл., Смолевичский р-н., г. Смолевичи, ул. Социалистическая, д. 54б) сообщает, что директором ЗАО «Смолевичи Молоко» 03.02.2020 г. принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется по состоянию на 03.02.2020 г.

УНП 690668083

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении на ЭТП «ТОРГИБЕЛ» повторных электронных торгов по продаже административного помещения МОАО «Красный металлист»

**Лот № 310120001:** административное помещение, инв. № 700/D-137723, площадь – 1820,2 кв. м, г. п. – 1973. Адрес: г. Могилев, ш. Гомельское,15А-1. Обременение: аренда – площадь – 87,1 кв. м на 3 года. **Начальная цена продажи с НДС – 389 700,00 бел. руб. Задаток** – 38 970,00 бел. руб. Шаг электронных торгов – 5 %

**Условия:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола. 2. Условия оплаты приобретенного объекта согласовываются сторонами при заключении договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % от цены продажи предмета электронных торгов, а также стоимость услуг оператора ЭТП в течение 3 (трех) банковских дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов

Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения электронных торгов составляет 2000,00 бел. руб.

Дата и время начала проведения электронных торгов 20.02.2020 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения, утвержденного постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).

**Продавец:** МОАО «Красный металлист», 212013, г. Могилев, шоссе Гомельское, д.15а, тел. 8 (0222) 76-27-16. Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Электронный адрес ЭТП: **http://торги.бел.** Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, г. Минск, не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах. **Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах 20.02.2020. Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляются на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 17.02.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2019 г.

**☎ Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

**ОАО «Управление механизации № 91» извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 4 марта 2020 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.**

Регистрация участников начинается с 8.45 по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

**Повестка дня:**

1. Об итогах работы финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2019 году и основных направлениях деятельности Общества на 2020 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2019 году.
3. Отчет о работе ревизионной комиссии в 2019 году.
4. Рассмотрение результатов ежегодной ревизии по результатам финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.

Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита Общества за 2019 год.

5. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества и направлений использования чистой прибыли за 2019 год.

Утверждение дивидендов за 2019 год.

6. Утверждение порядка распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2019 год. О направлениях использования чистой прибыли и периодичности выплаты дивидендов по результатам деятельности Общества в 2020 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Об установлении вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

**Тел. 8 (017) 337-65-80**

**Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91»**

УНП 100055130

---

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **унитарное предприятие «Ружанская мебельная фабрика»** (УНП 200254688) 225295, Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Заводская, д. 4, в лице управляющего в деле о банкротстве ООО «ПРАЙМДИРЕКТ», тел. +375 (29) 795-55-39.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 142-10Б/2018 в экономическом суде Брестской области будут проведены: **9 марта 2020 г**. **09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**. Прием заявок и задатков по 06.03.2020 г. 17.00.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Минимальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 160/С-27957. Котельная. Общая площадь 194,7 $м^2$ | 3708,54 | 2410,55 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 160/С-30165. Дымовая труба. Высота 30 м | 5356,78 | 3481,91 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 160/С-30164. Пожарный водоем. Объем 735 $м^3$ | 927,14 | 602,64 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 160/С-30163. Общая площадь здания 6,1 $м^2$ | 41,21 | 26,79 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 124/С-17872. Трансформаторная подстанция. Общая площадь здания 37,5 $м^2$ | 947,74 | 616,03 |
| 6 | Капитальное строение с инв. № 160/С-30227. Здание лесопильного цеха, включающее материальный склад, мастерскую, склад, навес, пилоточку. Общая площадь здания 882,1 $м^2$ | 12 979,89 | 8436,93 |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 124/С-18430. Проходная. Общая площадь здания 20,1 $м^2$ | 1318,59 | 857,08 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 124/С-18422. Здание конторы, включающее двухэтажное здание конторы, здание материально-заготовительного отделения, здание сборно-обойного отделения, два здания отделочно-сушильного отделения, здание материального склада, четыре холодные пристройки, уборную. Общая площадь здания 3132 $м^2$ | 47 798,96 | 31 069,32 |
| 9 | Капитальное строение с инв. № 124/С-18431. Склад готовой продукции. Общая площадь здания 177,6 $м^2$ | 2472,36 | 1607,03 |
| 10 | Капитальное строение с инв. № 124/С-18429. Здание гаража. Общая площадь здания 175,4 $м^2$ | 2884,42 | 1874,87 |
| ***Расположены на земельном участке с кадастровым № 125656200001000124 по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, Шерешевский с/с, г. п. Шерешево, ул. Урицкого, 1А, 4А*** | | | |
| 11 | CHERY TIGGO, легковой внедорожник хэтчбек, рег. знак 4423 IB-1, 2011 г. в. | 3700,00 | 2405,00 |
| 12 | АВТОМ КРОМКООБР CT-K AKRON 245 | 3400,00 | 2210,00 |
| 13 | Станок деревообрабатывающий фрезерный с ЧПУ «Армас» | 3000,00 | 1950,00 |
| 14 | Покрасочная камера мод. Р.5.В | 3400,00 | 2210,00 |
| 15 | Станок автоматический двухпильный заусовочный с дв. | 3100,00 | 2015,00 |
| 16 | Деревообрабатывающий центр с ЧПУ ROY-ER для фрезеро | 10 900,00 | 7085,00 |
| 17 | Станок фрезерный | 3700,00 | 2405,00 |
| 18 | Вайма с четырьмя рабочими плитами | 3400,00 | 2210,00 |
| 19 | Станок для облицовывания кромок, Италия | 3100,00 | 2015,00 |
| 20 | Автоматический сверлильный станок проходного типа | 20 200,00 | 13 130,00 |
| 21 | Пресс вакуумный МВП 2512 № 215 (Б) | 6700,00 | 4355,00 |
| 22 | Пресс вакуумный МВП 2512 № 215 | 6700,00 | 4355,00 |
| 23 | Станок пневматический сверлильно-присадочный Tos | 3300,00 | 2145,00 |
| 24 | Установка раскроя с одной линией распила, Италия | 18 100,00 | 11 765,00 |
| 25 | Обрабатывающий центр с ЧПУ мод ARROW ATS-BIESSE | 29 300,00 | 19 045,00 |
| 26 | Станок деревообрабатывающий фрезерный с ЧУП «Армас» | 3000,00 | 1950,00 |
| **Местонахождение** – Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2 | | | |
| 27 | Фильтр рукавный ФРБМ | 4700,00 | 3055,00 |
| 28 | Станок 4-сторонний строгальный «Квадрмат 23П» | 10 600,00 | 6890,00 |
| **Местонахождение** – Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Шерешево, ул. Урицкого, 1А | | | |

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 142-10Б/2018 в экономическом суде Брестской области будут проведены: **20 февраля 2020 г**. **09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.** Прием заявок и задатков по 19.02.2020 г. 17.00. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Заря» от 11.10.2019 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Минимальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 124/С-17635 (наименование – магазин), расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Коссовская, 7А на земельном участке с кадастровым номером 125655500001000138 площадью – 0,2251 га с целевым назначением участка – для обслуживания магазина с правом постоянного пользования (Правообладатель-Республика Беларусь), площадь капитального строения 520,6 кв. м с составными частями и принадлежностью – пристройка, имущественные права – право хозяйственного ведения УП «Ружанская мебельная фабрика», целевое назначение – здание специализированное розничной торговли | 55 885,83 | 15 967,38 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

**Для участия в торгах необходимо:** 1. Зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.** 2. Перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее десяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Подробнее на beltorgi.by.

Жыццёвінкі

# СВАЯ ЗЯМЛЯ

## СМАК ФІНІКАЎ

У нашу Іскань у канцы пяцідзясятых гадоў прыехалі дзве выпускніцы Магілёўскага педінстытута — Галіна Стасевіч і Яўгенія Мінкіна. Апошняя пабыла год і пакінула школу. Кажуць, быццам выйшла замуж і сёння жыве ў Калінінградзе. Хоць і мала папрацавала, аднак успаміны пра яе засталіся добрыя. Як забыць хаця б тое, што Яўгенія Іванаўна звазіла наш клас у Магілёў на экскурсію, а паколькі яе бацькі жылі ў гэтым горадзе, то пазнаёміла нас з імі. Бацькі настаўніцы пачаставалі ўсіх гасцей — дзе толькі талерак набралі! — смачным «гарадскім» абедам. Што было на другое, сёння не прыгадаю, але спадабаўся вельмі боршч. Чырвоны, з бурачкоў. Як кажуць у такіх выпадках, мы і лыжкі аблізалі.

І ўсё ж, згадваючы гэтых маладых, прыгожых дзяўчат-настаўніц, я і яшчэ два сябры найбольш успамінаем смак фінікаў. Баршчы мы сёрбалі і ў сваёй вёсцы, былі яны наварыстыя і не менш апетытныя, чым той гарадскі. А вось фінікі елі ўпершыню...

Галіна Сцяпанаўна была з Быхава, і таму на выхадныя дні нярэдка ездзіла ў райцэнтр да маці. Аўтобус тады ў нашу вёску не хадзіў, і ёй трэба было ісці пешшу ад асфальту ажно шэсць кіламетраў. І не проста ісці, а нешта ж і ў руках несці. Хоць у Іскані і была крама, аднак у горадзе, несумненна, выбар прадуктаў быў больш шырокі, а хлеб наогул тады да нас не завозілі — усе яго пяклі самі. Толькі ж не маладая настаўніца.

Узімку дні, як вядома, надзвычай кароткія, і, калі Галіна Сцяпанаўна выходзіла з аўтобуса на прыпынку ў Абідавічах, рабілася ўжо зусім цёмна. Тады ж і электрычнасці не было ў нашай і бліжэйшых вёсках. Гэта цяпер лямпачкі гараць на слупах. А ёй жа, маладой дзяўчыне, трэба было ісці праз усе Абідавічы, праз Дружбу... Няблізка. Адбівацца ад сабак — гэта яшчэ што, дарог жа таксама амаль не было.

І тады мы, я, Валерка Юрчанка і Славік Сныткоў, узялі за правіла сустракаць Галіну Сцяпанаўну. Узімку бралі санкі, з намі бег Шарык, не помню ўжо чый сабака — ці тое Валеркі, ці тое Славіка. Усім нам было хораша, весела, і дарога ў два канцы пралятала хутка і непрыкметна.

Даводзілі настаўніцу да хаты бабы Ганны, дзе тая кватаравала, а там яна частавала нас гарадскімі ласункамі. З усіх іх чамусьці запомніліся фінікі. І не толькі мне... Калі Галіны Сцяпанаўны не стала — а пражыла яна ўсё жыццё ў нашай Іскані, нарадзіла пяцёра дзяцей, узначальвала шмат гадоў васьмігодку, апошні час была старастай вёскі, — то я патэлефанаваў Валерку Юрчанку ў Магілёў, каб паведаць сумную вестку. Пасля пэўнай паўзы мой аднакласнік ціха прамовіў:

— Я і сёння адчуваю смак фінікаў, якімі частавала нас Галіна Сцяпанаўна...

То былі сумленна зароблены фінікі. Таму, відаць, і такія смачныя.

## КРЫЎДА

Сусед Пятровіч завітаў да мяне надвячоркам, і быў ён, як кажуць, «на ўзводзе». Прысеўшы на прапанаванае крэсла, пачаў скардзіцца:

— От жа прыдумалі! Віншуюць мяне сёння, ты толькі паслухай, з днём пажылога чалавека. З прафсаюза. Так і так, маўляў, паважаны Андрэй Пятровіч, прымі сардэчныя віншаванні... Жадаем здароўя, шчасця ў жыцці і гэтак далей... Падзякаваў, канешне ж, я ў адказ. За клопат і ўвагу. А потым, як толькі паклаў трубку, нібы ачомаўся, працверазеў: знайшлі з чым віншаваць — са старасцю. Якое ж гэта свята? Што ж у ёй, у гэтай старасці, добрага? І тут баліць, і там баліць... На дрэва, як раней, не залезеш, каб той жа яблык зняць. Калі нахіляешся, каб завязаць шнуркі, то думаеш, што б яшчэ заадно зрабіць. Вунь і кавеньку ўжо прыдбаў. Без яе хітае. Хаджу ў паліклініку, як раней хадзіў на працу. Дык з чым тут віншаваць? Свята, я не пярэчу, аднак мала радасці яно мне дае — не ведаю, як каму... Чаму маўчыш? Што скажаш?

Я наліваю ў кубачкі каву, сядзім, гамонім пра жыццё. Пра тое, што мо і не трэба асабліва крыўдаваць Андрэю Пятровічу на старасць, бо ўсё ж не кожнаму Бог даў да ягонага веку дажыць — амаль восемдзесят гадкоў мае. Зноў жа, двух сыноў выгадаваў і дачку, цяпер да яго горнуцца ўнукі. «Асабліва калі пенсію атрымліваю», — удакладняе сусед, і лёгкая, пяшчотная ўсмешка набягае на ягоны чыста паголены твар. Потым перабралі, хто з ягоных аднакласнікаў і аднагрупнікаў па інстытуце пайшоў ужо ў іншы свет — такіх, на жаль, аказалася многа. А табе, кажу, Пятровіч, пашанцавала. Хоць тут і там баліць, але ж ты можаш радавацца кожнаму новаму дню, а калі спаць кладзешся, то — пражытаму. Можаш радавацца нават дажджу, снегу, ветру, зялёным дрэвам, небу... На цябе яшчэ, пытаюся, бурчыць іншы раз баба Марыя? Адказвае: не без таго! Значыць, жыццё ідзе.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— А і праўда, не так ужо ўсё і кепска, — Пятровіч дзякуе за каву і павольна ўзнімаецца. — Дарэмна крыўдаваў на прафсаюз. Няхай жыве свята пажылых людзей. Няхай віншуюць і мяне. Дазваляю. І чым больш разоў, тым лепей. Ты мяне пераканаў. Дзякуй.

Ён пайшоў, а я яшчэ пэўны час сядзеў нерухома. Да свята пажылых людзей мне заставалася на той час не надта доўга.

Але я цвёрда вырашыў: не буду крыўдаваць, калі і мяне хто павіншуе. Як вось Пятровіча. Толькі парадуюся.

## НЕДАРАВАЛЬНА

Непрадказальна іншы раз складваецца лёс чалавека. Аляксандр Іванавіч жыў у Светлагорску, меў добрую і любімую працу, а тут здарылася бяда: захварэла малодшая дачка. Каб выратаваць яе, дактары параілі тэрмінова і неадкладна памяняць наш беларускі клімат на больш сонечны і цёплы. Во як! Што ж рабіць? Як быць? І дзе, у якой краіне шукаць той спякотны клімат? Сур'ёзна задумаліся ў сям'і Аляксандра Іванавіча. Крок адказны, пагадзіцеся. Акрамя дачкі, у сям'і ёсць яшчэ два сыны-школьнікі. Хоць і цяжка, няпроста было, аднак цвёрда вырашылі на сямейнай нарадзе: трэба ратаваць дачку і сястру. Балазе ва Узбекістане жыве брат жонкі Аляксандра Іванавіча, патэлефанавалі яму, растлумачылі сітуацыю. Сваяк абрадаваўся: прыязджайце, вядома! І мне веселей будзе. А жыць дзе? Ды на Беларусь памяняць кватэру ахвотнікаў знойдзецца багата.

Сказана — зроблена. Неўзабаве Аляксандр Іванавіч перавёз сям'ю ў Наваі. Сваю двухпакаёўку памянялі на кватэру значна большых памераў. Горад прыгожы. Прамысловы. Уладкавацца на працу не праблема. Дзеці пайшлі ў школу. Як добраму і стараннаму работніку, выдзелілі Аляксандру Іванавічу дачны ўчастак, і там неўзабаве вырас прыгожы двухпавярховы дамок. Суседзі ківалі не без зайздрасці: бач, які спрытны гэты бульбаш!.. А самае галоўнае — дачка пайшла на папраўку. А потым і зусім забыліся на тое, што некалі яна хварэла.

А тым часам у далёкай цяпер ужо беларускай вёсцы жылі бацькі Аляксандра Іванавіча. Калі раней ён мог часта наведвацца да іх, то цяпер раз у год, а тое і ў два. А неяк бацька сам напрасіўся ў госці. Прыехаў. Была тады восень, залатая пара ў Навае. Спякота спала. Цёпла, утульна. «Дык вы тут у раі жывяце!» — пазайздросціў бацька. «Дык у чым справа? Перабірайцеся з мамай да нас! Месца хопіць!» — абрадаваўся сын. Што там было перабірацца. Выпісаліся ў сельсавеце, узялі тое-сёе з рэчаў, і ў шлях-дарогу. Паколькі маці пабаялася ляцець на самалёце, то дабіраліся да новага месца жыхарства на цягніку — амаль чацвёра сутак.

Але тады ніхто і не падумаў, што бацькі дажываюць ужо свой век. Не-не ды і прызнаваліся з сумам і непрыхаваным болем у вачах старыя, што хацелі б знайсці апошні прытулак на сваіх беларускіх могілках, а не тут, на чужыне... Аляксандр Іванавіч суцяшаў: ды што вы заладзілі! Вы ж у мяне яшчэ — ого!.. Жывіце і ні аб чым не думайце.

Думай не думай, а неўзабаве памёр бацька. Нядоўга пасля яго пражыла і маці. Пахавалі, вядома ж, іх у Навае. Пайшоў з жыцця і брат жонкі, дзеці разляцеліся хто куды. З нявесткай адносіны не склалася. І вось тады Аляксандр Іванавіч і сам засумаваў па Беларусі. Якраз распаўся СССР. Многія славяне пачалі вяртацца на радзіму сваіх продкаў. Памяняць кватэру, як гэта ён сам зрабіў некалькі гадоў назад, не атрымалася. Найбольш нецярплівыя проста пакідалі жыллё, чым, канешне ж, збівалі цану на яго. Давялося прадаць за мізэрныя грошы і дачу, і кватэру, і легкавік. Амаль улегцы вярнулася сям'я Аляксандра Іванавіча на радзіму. Паколькі грошай на гарадскую кватэру не хапала, купілі хату пад горадам у вёсцы, пэўны час гаспадар і хлопцы ездзілі на працу ў райцэнтр на аўтобусе... Пазней разжыліся на легкавік. Калі Аляксандру Іванавічу, як добраму і адказнаму спецыялісту, выдзелілі службовае жыллё, стала лягчэй. Пажаніліся сыны, выйшла замуж дачка. Здавалася б, жыві ды радуйся. Аднак баліць у яго, цяпер ужо глыбокага пенсіянера, душа, што не можа пабываць на магіле бацькоў. Далёка надта. Прызнаецца іншы раз блізкім знаёмым:

— Дараваць сабе не магу! Навошта сарваў іх, старых? Хіба ж цяжка было прадбачыць сітуацыю? Калі шчыра, я ж і сам не збіраўся дажываць свой век ва Узбекістане. Людзі там да нас, беларусаў, ставіліся вельмі добра. Але ж Радзіма ёсць Радзіма, свая зямля ёсць свая зямля! Даруйце, тата і мама! Гэта быў мой, сынаў, промах. А вось сам я ніколі сабе гэтага не дарую... Ніколі...

**Васіль ТКАЧОЎ.**

Спытайце пра радзіннае

# Ці месца чырвонаму колеру ў труне?

**Ліст Н. У. Красінскай з Магілёўскай вобласці: «На пахаванні мужа жанчыны звярнулі ўвагу на тое, што гальштук у яго быў чырвоны. Загадалі абавязкова памяняць, таму што чырвонае ў труне быць не павінна. На наша пытанне, а чаму нельга, адказала проста: «Так жанчыны сказалі, а чаму — не ведаю».**

Розныя кантэксты рытуальнага ўжывання чырвонага колеру даюць падставы расшыфроўваць яго як сімвал жыццёвага пачатку, а таксама пацвярджаюць трактоўку бінарнай апазіцыі чырвонага і белага колераў як супрацьпастаўлення жыцця і смерці.

Даўней падчас родаў праз парадзіху перакідвалі чырвоную нітку (пояс), якая выконвала ролю магічна-ахоўнага сродку. Менавіта таму хочацца параіць будучым матулям: на працягу ўсяго перыяду цяжарнасці разам з вамі павінен быць чырвоны пояс-абярэг. На Беларусі доўгі час жыла цудоўная традыцыя першага рытуальнага купання дзіцяці. Бабуля асцярожна купала немаўля, а потым спавівала ў белыя пялёнкі і перавязвала поясам чырвонага колеру. Прычым як нацельныя рэчы для кожнага нованароджанага, так і пояс у сям'і былі адны і тыя ж (імкнуліся яднаць усіх дзетак гэтай сям'і). Падкрэсліваем, чырвоным поясам перавязвалі і хлопчыка, і дзяўчынку. Сучасныя матулі «запазычылі» чужую традыцыю і перавязваюць нованароджаных ружова-блакітнымі стужкамі.

Ахоўную ролю выконваў гэты ж пояс, калі ў сям'і нехта з блізкіх паміраў: бабуля перавязвала цяжарную або нованароджанага чырвоным поясам.

Парог — гэта своеасаблівая мяжа паміж мінулым і будучыняй. Падчас вяселля бабуля праз той самы парог павінна была палажыць чырвона-белы ручнік (пралажыць масток) такім чынам, каб чырвоныя канцы былі перад і за парогам, а непасрэдна над парогам ляжала белая частка. Жаніх станавіўся на чырвонае поле, браў маладую на рукі, пераносіў яе над недатыкальнай зонай, маркіраванай белым колерам, і станавіўся на процілеглае поле чырвані. Публічна, у прысутнасці радні і з яе згоды пераход у новае жыццё заканчваўся.

Адным з галоўных атрыбутаў беларускага вяселля быў каравайны абрад, які сімвалізаваў жыццесцвярджальнае радавое адзінства, пачатак новага жыцця. Асноўным колерам, якім апісвалі каравай, быў чырвоны. У вясельнай песні знаходзім: «Ой, чырвоны каравай, чырвоны, знаю, яго чырвоныя (прыгожыя) рабілі...» Заканчвалася кампазіцыя каравая парай галубкоў (сімвал маладых), якіх таксама перавязвалі чырвонай стужкай.

З аналагічным ужываннем колераў-сімвалаў мы сутыкаемся і на пахаванні. Згодна з традыцыяй, труну з нябожчыкам апускалі ў магілу на чырвона-бела-чырвоных ручніках. Атрымлівалася форма перавернутай аркі — «лодкі смерці» (добра вядомай па мастацкіх выявах у культурах розных народаў свету — на ёй нябожчыка адпраўлялі (перапраўлялі) на той свет). Мужчыны, якія апускалі труну ў магілу на ручніках, каб засцерагчыся ад смерці, трымаліся за іх чырвоныя канцы. Інакш кажучы, памерлы знаходзіўся на белай частцы ручніка — зоне смерці, а жывыя кантактавалі з чырвоным сегментам — зонай жыцця.

Становіцца зразумела, што **ў прасторы труны, у тым ліку і ў адзенні нябожчыка, не павінна быць нічога чырвонага.** Нашы інфарматары ў розных рэгіёнах Беларусі настойліва падкрэслівалі, што гэта недапушчальна, каб не спраўкаваць смерць блізкіх сваякоў.

У народнай медыцыне наяўнасць чырвонага колеру была складовай кампанентай пры лячэнні рожыстага запалення, спалоху, сурокаў. Падчас цяжкай працы, напрыклад жніва, хворыя руку ці нагу абвязвалі ніткай ці палоскай тканіны чырвонага колеру.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

***Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».***

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Здароўе. Практычны падыход

# З маленькімі сэрцамі ў такт

## працуе РНПЦ дзіцячай хірургіі

**Беларускія дзіцячыя кардыёхірургі сваімі ўнікальнымі аперацыямі вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Цяжка ўявіць, што яшчэ 25 гадоў таму яны самі вучыліся ў расійскіх і азербайджанскіх калег. Сёння тут робяць сапраўдныя цуды: выратоўваюць немаўлят вагой крыху больш за кілаграм (напрыклад, робяць аперацыі па рэканструкцыі кішэчніка, дыяметр якога ў маленькага пацыента ўсяго чатыры міліметры!), спыняюць на некалькі гадзін дзіцячыя сэрцы падчас хірургічных умяшанняў, каб потым запусціць іх працаваць без збояў. Многае з таго, што тут робяць малым, ва ўсім свеце выконваюць толькі дарослым. Сёлета РНПЦ дзіцячай хірургіі споўнілася 50 гадоў. Мы згадалі, чым за мінулы год здзівілі медыцынскую грамадскасць урачы гэтага цэнтра.**

### З датчыкам УГД проста ў сэрцы

У снежні 2019-га ўпершыню на прасторы СНД у РНПЦ дзіцячай хірургіі была праведзена ўнікальная аперацыя па закрыцці дэфекту міжпрадсэрдзевай перагародкі пад кантролем унутрысардэчнай ультрагукавой дыягностыкі.

Гэта гісторыя пачалася дастаткова даўно — адзінаццаць гадоў таму, калі нарадзіўся Усевалад. Урачы адразу выявілі ў немаўляці некалькі парокаў развіцця. У прыватнасці, атрэзію стрававода і дэфект міжпрадсэрдзевай перагародкі.

Амаль адразу пасля нараджэння хлопчык быў першы раз прааперыраваны. Пасля ён перанёс цэлую серыю складаных аперацый па аднаўленні стрававода. І вось летась, калі Усевалад падрос, было прынята рашэнне выправіць дэфект сэрца. Як расказаў **дырэктар цэнтра Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ**, у пераважнай большасці такія аперацыі робяцца без спынення сэрца і вялікага разрэзу. Працэдуру і ў гэтым выпадку вырашылі правесці пункцыйна — праз маленькі пракол у сцягне правесці ў сэрца катэтар і ўстанавіць у дэфект перагародкі спецыяльную прыладу — аклюдар.

Але была адна вялікая складанасць: для выканання аперацыі патрабавалася ўвесці ў стрававод датчык УГД для інтрааперацыйнага кантролю. У выпадку з Усеваладам гэта аказалася немагчыма: яго стрававод сфарміраваны з трансплантаванай кішкі і размяшчаецца ззаду грудзіны перад сэрцам. З прычыны такіх асаблівасцяў (з-за высокай рызыкі траўміравання стрававода) была немагчымая і звычайная адкрытая хірургічная аперацыя. Урачы прынялі рашэнне правесці яе пад кантролем унутрысардэчнага ўльтрагукавога датчыка.

У выніку спецыяльны мініяцюрны датчык быў праведзены непасрэдна ў сэрца пацыента праз сцегнавую вену. І хірург рабіў аперацыю пад візуальным ультрагукавым кантролем знутры сэрца пацыента! Аперацыя прайшла паспяхова, дэфект быў закрыты. Паколькі ўскладненняў не ўзнікла, у хуткім часе маленькі пацыент з мамай вярнуўся дадому.

### Сэрца спынілі больш чым на тры гадзіны

Калі ў папярэдняй аперацыі спыненне сэрца не спатрэбілася, то дзеля выратавання жыцця яшчэ аднаго маленькага пацыента РНПЦ дзіцячай хірургіі яго сэрца спынілі больш чым на тры гадзіны.

Маленькі Ян жыве з бацькамі ў Смаргоні. Яму тры з паловай гады. Пры нараджэнні ў хлопчыка была дыягнаставана паталогія аартальнага клапана. На яго сэрцы беларускія кардыёхірургі і правялі найскладанейшую аперацыю. Само маленькае сардэчка спынялі на 3 гадзіны 20 хвілін. Канстанцін Драздоўскі адзначыў, што ў дарослым узросце пацыенту маглі б імплантаваць механічны пратэз, але ў выпадку з дзецьмі так зрабіць нельга. Было вырашана правесці хлопчыку ўнікальную аперацыю Роса-Кона — складанае ўмяшанне, калі аартальны клапан замяшчаецца лёгачным, а замест лёгачнага ўшываецца біяпратэз.

Адзначым, што ў 1967 годзе брытанскі кардыёхірург Дональд Рос правёў першую ў свеце аперацыю па замене пашкоджанага аартальнага клапана клапанам лёгачнай артэрыі. Цяпер аперацыя Роса лічыцца залатым стандартам хірургіі. Праўда, традыцыйна такія ўмяшанні робяць у дарослым узросце.

На аперацыйным стале Ян правёў 14 гадзін, у тым ліку на працягу больш чым трох з іх яго сэрца не працавала. У хірургічным умяшанні ўдзельнічалі 10 спецыялістаў. Яны запратэзавалі лёгачны клапан спецыяльным біяпратэзам, аднавілі функцыю сэрца, выдалілі тканку з левага жалудачка. Акрамя таго, хлопчыку зрабілі пластыку клапана. Цяпер парок сэрца скарэктаваны цалкам, а здароўю маленькага Яна нічога не пагражае.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

### У выпадку няўдачы — толькі перасадка

Яшчэ адна рэдкая і ўнікальная аперацыя прайшла ў цэнтры летась. У дзіцяці выявілі гіпертрафічную кардыяміапатыю — у дзяцей такая паталогія сустракаецца даволі рэдка. Малых таксама апераруюць нячаста, звычайна чакаюць, пакуль пацыент вырасце.

— Праблема была ў тым, што ў дзіцяці левы жалудачак цалкам зарос мышцамі. Наша задача была выразаць новую полацсць для левага жалудачка, — расказаў Канстанцін Драздоўскі.

Ён адзначыў, што ў выпадку няўдачы малога магла б выратаваць толькі перасадка сэрца. Аднак беларускія кардыёхірургі чарговы раз прадэманстравалі свой высокі клас.

— У Расіі, ЗША, Германіі, Францыі дзіцячых хірургічных цэнтраў, падобных на наш, у краіне некалькі, таму яны могуць выбіраць сабе спецыялізацыі. Прыроджаных парокаў сэрца вельмі шмат — больш за 250. Сярод іх ёсць рэдкія і складаныя. Напрыклад, у Германіі кожны цэнтр спецыялізуецца на пэўных відах парокаў, паспяхова апераруе іх, усе пра гэта ведаюць, і жанчыны мэтанакіравана едуць туды нараджаць. У нас няма магчымасці выбіраць — мы апераруем усё. Атрымліваецца, што ў год мы робім 1040—1200 аперацый па карэкцыі парокаў сэрца, — кажа Канстанцін Драздоўскі. — Пры гэтым лятальнасць у нас на дастаткова нізкім узроўні, лічбы адпавядаюць сусветным.

### Вага пацыента — крыху больш за кілаграм

Яшчэ адну аперацыю можна назваць унікальнай таму, што яна была праведзена пацыенту з масай цела 1 кілаграм 135 грамаў. Гэта была карэкцыя прыроджанага пароку сэрца — стэнозу клапана лёгачнай артэрыі. Выпадак стаў унікальным у гісторыі дзіцячай кардыёхірургіі.

— Паводле нашых звестак, у свеце пакуль што не праводзіліся настолькі складаныя аперацыі малому з такой вагой, — адзначыў Канстанцін Драздоўскі.

Дзіця нарадзілася заўчасна і, на жаль, мела патрэбу ў тэрміновай хірургічнай дапамозе. Спецыялісты двух РНПЦ — «Маці і дзіця», дзе яно і з'явілася на свет, і дзіцячай хірургіі — спрацавалі зладжана. Аперацыя прайшла паспяхова, але ёй папярэднічала сур'ёзная падрыхтоўчая работа спачатку неанатолагаў, а потым і кардыёхірургаў, анэстэзіёлагаў і іншых спецыялістаў.

### Трансляцыі з аперацыйнай для замежных калег

А ў студзені год таму некалькі паспяховых аперацый і майстар-класаў правялі дзіцячыя кардыяхірургі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах у клініцы Аль-Касімі. У беларускую каманду ўваходзіла сем урачоў і шэсць медсясцёр. Пры гэтым яшчэ 20—25 гадоў таму беларускія дзіцячыя кардыяхірургі вучыліся ў Расіі і Азербайджане. Цяпер РНПЦ дзіцячай хірургіі сам з'яўляецца адукацыйным цэнтрам. Складаныя аперацыі транслююць непасрэдна з аперацыйнай для ўрачоў, якія павышаюць кваліфікацыю. У нашых кардыяхірургаў вучацца калегі з Расіі, Украіны, Азербайджана, Грузіі, Узбекістана і нават Эквадора.

У ААЭ кардыёхірургі правялі пяць умяшанняў. Першага прааперыравалі сямігадовага хлопчыка з прыроджаным парокам сэрца. У яго дыягнаставалі дэфект міжжалудачкавай перагародкі. А самым маленькім пацыентам стаў сямімесячны малы з камбінаваным прыроджаным парокам сэрца.

Падрыхтоўка да работы ў гэтай краіне вялася на працягу паўтара гадоў. Дэлегацыя міністэрства аховы здароўя і прафілактыкі захворванняў Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў яшчэ летам 2017 года падчас перамоў звярнулася па дапамогу ў стварэнні службы дзіцячай хірургіі ў адным са шпіталяў краіны. Пасля быў падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж міністэрствамі аховы здароўя абедзвюх краін.

Для Беларусі такое супрацоўніцтва і прызнанне поспехаў беларускіх кардыёхірургаў у свеце таксама важнае, адзначаў тады Канстанцін Драздоўскі.

Штогод у РНПЦ дзіцячай хірургіі выконваецца больш за пяць тысяч аперацый, з іх каля 1 200 на сэрцы, каля чатырох тысяч на органах груднай клеткі, брушной поласці і іншых.

Скажыце, доктар...

# Як часта трэба прыбіраць?

**Што будзе, калі не рабіць вільготную прыборку кожны тыдзень? Пра гэта расказала ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кацярына СУХАВЕР.**

Дык што ж такое пыл і што за бруд збіраецца на паверхнях мэблі і падлозе?

— Каля 70 працэнтаў хатняга пылу мае прыроднае паходжанне. Гэта часцінкі глебы і мінералаў, кветкавы пылок, споры і грыбкі, экскрэменты насякомых, поўсць, пух і перхаць хатніх жывёл, крышталі марской солі і нават касмічны пыл. Астатнія 30 працэнтаў вырабляюцца самімі людзьмі — гэта часцінкі адмерлай скуры, валокны тканіны ад адзення, тэкстылю, абшыўкі мэблі і паперы, цыгарэтны попел, гумавы пыл (ад аўтамабільных пакрышак, якія сціраюцца), цяжкія металы, — расказвае спецыяліст.

Чым небяспечна ўсё гэта? Справа ў тым, што збіранне пылу і бруду ў цяжкадаступных месцах стварае спрыяльныя ўмовы для размнажэння розных бактэрый, цвілі, пылавых кляшчоў ды іншых арганізмаў. Усе яны могуць прынесці сур'ёзныя непрыемнасці: алергію, грыбковыя інфекцыі дыхальных шляхоў, сухасць скуры, кан'юнктывіт, астму, менінгіт, сілікоз (від пнеўманіі), захворванні нырак. А само знаходжанне ў забруджаным памяшканні вядзе да павышанай стамляльнасці, дыскамфорту і зніжэння імунітэту.

Дык як часта трэба прыбірацца? Перыядычнасць прыборкі ў доме, у тым ліку і вільготнай, вызначае яго гаспадар ці гаспадыня, але пажадана гэта рабіць не радзей, чым раз на тыдзень. У большасці ж устаноў прыбіраць трэба штодзённа. А ў дзіцячых, бальнічных, харчовых установах прыборка праводзіцца як мінімум двойчы на дзень. І гэта не толькі мыццё падлогі, але і дэзінфекцыя паверхняў спецыяльнымі растворамі.



Вільготная прыборка мае перад сухой свае перавагі. Яна дазваляе пазбавіцца ад пылу, бруду, хваробатворных бактэрый і грыбкоў, не дазваляе з'яўляцца пылавым кляшчам і ўзнікаць алергіям, а таксама дапамагае пазбегнуць рэцыдываў у алергікаў. Пры вільготнай прыборцы пыл збіраецца ў ваду, і шкодныя рэчывы мы не ўдыхаем (у адрозненне ад сухой яе альтэрнатывы).

На думку спецыяліста, для правядзення прыборкі патрабуецца просты інвентар і наступныя мерапрыемствы:

— Падрыхтуйце гумавыя пальчаткі, анучы, губкі, швабру, вядро і мыйныя сродкі. Калі ў доме ёсць алергік, апошнія трэба выбіраць асабліва старанна. Рэгулярна мыйце падлогу, пыласосце дываны і працірайце месцы збірання пылу вільготнай анучкай. Важна праціраць пыл і ў цяжкадаступных месцах (на секцыях, карнізах і высокіх шафах). Не варта забываць і пра бытавую тэхніку: халадзільнік, тэлевізар, мікрахвалевую печ.











# УСЕ КНІГІ — У ГОСЦІ ДА НАС

Літаральна ўчора, на пярэдадні адкрыцця XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу мне ўдалося з фотакамерай у руках паназіраць, як рыхтаваліся да галоўнага кніжнага форуму Беларусі. Атмасфера ў выставачным павільёне, нягледзячы на клопаты і рабочую мітусню, была надзіва душэўная, нібы пранізаная прадчуваннем свята. Зрэшты, хіба з кнігамі можа быць інакш?

Галоўная сцэна, на якой сёння будзе праходзіць урачыстае адкрыццё, а ў наступныя дні пройдуць прэзентацыі кніг, уручэнне дыпломаў, выступленні выдаўцоў і пісьменнікаў, канцэрты артыстаў, была ўжо ўстаноўлена. Адным з першых рыхтаваўся стэнд цэнтральнага экспанента выстаўкі — Злучаных Штатаў Амерыкі. На стэндзе будуць прадстаўлены болей за 100 выданняў друкаванай прадукцыі ў выглядзе кніг і альбомаў, часопісаў і брашур на англійскай мове, сярод якіх значнае месца займаюць выданні турыстычнай тэматыкі.

